«КОВІД». ПАРАДЫ БЫВАЛЫХ 4

ГРУЗЧЫК, ДВОРНІК, ВАРТАЎНІК... МАСТАК! 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 СНЕЖНЯ 2020 г. СЕРАДА № 245 (29359)

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КУНЦЭВІЧ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, кіраўнік рабочай групы рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы VI Усебеларускага народнага сходу:

«Унесеныя на сёння прапановы закранаюць у першую чаргу актуальныя пытанні, якія маюць на мэце доўгатэрміновую перспектыву. Напрыклад, з улікам цяперашняй геапалітычнай сітуацыі многія ўдзельнікі грамадскай дыскусіі ўказваюць на мэтазгоднасць замацавання на канстытуцыйным узроўні каштоўнасці нацыянальнага суверэнітэту, тэрытарыяльнай цэласнасці і незалежнасці Беларусі, гісторыка-культурнай самаідэнтыфікацыі народа, памяці аб Перамозе ў Вялікай Айчыннай вайне, інфармацыйнай і экалагічнай бяспекі. Досыць актыўна ўносяцца прапановы па перараз мяркаванні паўнамоцтваў паміж галінамі ўлады, карэкціроўцы выбарчай сістэмы, далейшым развіцці грамадскіх інстытутаў, павышэнні ролі мясцовага кіравання і самакіравання, фарміраванні канцэптуальных асноў і каштоўнасных арыентацый беларускага грамадства».

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ВАША СПРАВА — ЛЯЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ, УСЁ АСТАТНЯЕ МЫ ЗАБЯСПЕЧЫМ, ЯК БЫ СКЛАДАНА НІ БЫЛО»

Фота БелТА.

Прэзідэнт працягвае знаёмства з метадамі лячэння хворых на «ковід» у рэгіёнах — учора ён наведаў Магілёўшчыну

Візіт Прэзідэнта ў Магілёўскую абласную клінічную бальніцу працягвае серыю паездак па ўстановах аховы здароўя, якія займаюцца лячэннем «ковідных» пацыентаў. Аляксандр Лукашэнка ўжо наведаў 4-ю і 6-ю гарадскія клінічныя бальніцы Мінска, Віцебскі абласны клінічны радзільны дом і Стаўбцоўскую цэнтральную раённую бальніцу.

Сярэдзіна, але не залатая

Пра работу Магілёўскай абласной клінікі ва ўмовах «ковіда» Прэзідэнту далажыў галоўны ўрач Анатоль Кулік. Медыцынская ўстанова забяспечвае дапамогай усю вобласць. Бальніца складаецца з чатырох карпусоў, кансультатыўнай паліклінікі, аддзялення цэнтра экстраннай медыцынскай дапамогі. Ложкавы рэзерв — больш за 850 месцаў.

Па словах кіраўніка бальніцы, у першую хвалю каранавіруса ў чэрвені пад «ковід»-пацыентаў было перапрафілявана адно з аддзяленняў бальніцы. Але прапрацавала яно толькі месяц. Зараз пад інфекцыйных хворых адведзена 350 ложкаў, 26 з іх — у рэанімацыі. Гэта складае 41 % ад ложкавай забяспечанасці ўсёй бальніцы.

СТАР. 2

І волен лёгкіх лыжаў бег

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

На лыжа-ролернай трасе ў сталічнай Вяснянцы «ў дапамогу» пакуль не шчодраму снегу з нябёс працуюць снегавыя пушкі. Таму лыжня ўжо ёсць і на ёй з задавальненнем катаюцца прадстаўнікі розных пакаленняў.

Будзьце пільнымі

У карткі самы вялікі вораг — доўгі язык кліента

У асноўным ашуканцы разлічваюць на тое, што мы занадта даверлівыя і... схільныя пагаварыць

У нашай краіне ў гэтым фінансавым сезоне прыкметна выросла колькасць махлярства з выкарыстаннем сацыяльнай інжынерыі, паведамляюць прадстаўнікі праваахоўных органаў. Як правіла, гэта незаконны метад атрымання інфармацыі, пры якім чалавек дае зламыснікам усе канфідэнцыяльныя звесткі аб сваёй банкаўскай картцы. Гаворка ў першую чаргу — аб тэлефонным махлярстве і аб фішынгавых сайтах. Іншыя віды махлярства паступова губляюць папулярнасць, напрыклад устаноўка скімераў у банкаматах і атрыманне даных картак у сацыяльных сетках. Сваю спецыфіку ў злачынства «размоўнага жанру» дадала і пандэмія каранавіруса. Пра гэта расказалі прадстаўнікі Нацбанка і МУС краіны на прэс-канферэнцыі.

СТАР. 6

КАРАТКА

- **У навагоднюю ноч мінскае метро будзе працаваць да 3.00, наземны грамадскі транспарт — да 4.00.**
- Еўрапейскія эксперты наведаюць БелАЭС 16—18 снежня.

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгодзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

«ВАША СПРАВА — ЛЯЧЫЦЬ ЛЮДЗЕЙ, УСЁ АСТАТНЯЕ МЫ ЗАБЯСПЕЧЫМ, ЯК БЫ СКЛАДАНА НІ БЫЛО»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прэзідэнт пацікавіўся, ці працягваюць аказваць у Магілёўскай абласной бальніцы спецыялізаваную дапамогу.

«Так, але ёсць скарачэнне на дзесяць працэнтаў. Раней былі суадносіны 60 працэнтаў — планавая і 40 — экстранная дапамога. За гэты год выйшлі на 50/50. Мы працягваем аказваць дапамогу па ўсіх кірунках», — адказаў галоўны ўрач і дадаў, што сёння ў бальніцы 108 свабодных ложкаў для «ковід»-хворых.

«На сёння, дзякуй богу, паўднёвыя вобласці добра сябе адчуваюць, а Магілёўская вобласць у сярэдзіне (па колькасці хворых — **«Зв.»**). Чаму вышэй, чым паўднёвыя? Бо Магілёўская вобласць не перахварэла ў першую хвалю, — лічыць Прэзідэнт.— Мінск нам дае палову хворых, бо скучанасць насельніцтва высокая і гэтыя боўтанні па Мінску даюць аб сабе ведаць».

Анатоль Кулік расказаў, што цяпер будуецца кардыялагічны корпус бальніцы і на Магілёўшчыне адбываецца аб'яднанне меддапамогі ў гэтай галіне вакол абласной бальніцы. «Будаўніцтва корпуса кардыялогіі каля буйной бальніцы пазбаўляе неабходнасці дубліравання дарагога абсталявання», — акцэнтаваў увагу медык. Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц дадаў: будаўніцтва плануецца завяршыць у лістападзе будучага года.

На ўласныя вочы

Кіраўнік дзяржавы наведаў «чырвоную» зону і ў Магілёўскай абласной бальніцы. Яму паказалі палаты з цяжкімі хворымі і пазнаёмілі з пацыентамі, што ідуць на папраўку.

«Не турбуйцеся, галоўнае. Жыць будзеце, усе цяжкасці засталіся ў мінулым», — супакойваў Прэзідэнт людзей.

У адказ ён чуў добрыя словы ў адрас медыкаў: «Выдатны персанал. Усё адрэгулявана, як у гадзіннікавым механізме — паступіў у палату, прыйшоў урач, абследавалі, зрабілі назначэнне, прыйшла медсястра і ідзе працэс лячэння. Строгая дысцыпліна».

«Аляксандр Рыгоравіч, вы ўжывую выглядаеце лепш, чым па тэлевізары», — прызнаваліся жанчыны. — «Дзякуй, буду часцей тады да вас прыязджаць. Гэта мне новы халат землякі пашылі. Таму так выглядаю», — жартаваў Прэзідэнт.

Складнікі здароўя

У пачатку размовы з калектывам клінікі Прэзідэнт пацікавіўся, хто з медперсаналу ўжо перахварэў на новы каранавірус, і здзіўлена адзначыў, што такіх каля паловы з прысутных.

«А вось я не ведаю, добра, калі чалавек перахварэў ці калі не хварэў, — прызнаўся ён, маючы на ўвазе імунітэт, які выпрацоўваецца арганізмам пасля барацьбы з інфекцыяй. — Пакуль мне ўрачы і вучоныя, спецыялісты яшчэ не сказалі, што лепш».

З пункту гледжання псіхалогіі, тым, хто ўжо зведаў гэту хваробу, лягчэй, лічыць Аляксандр Лукашэнка, хоць, вядома, лепш ніколі і нічым не хварэць, тым больш у цяперашні час. Ён пажадаў прысутным здароўя напярэдадні навагодняга свята і ў новым годзе і адзначыў, што ў гэтым пытанні вялікі складнік — экалогія.

Дарэчы, з-за надвор'я Аляксандр Лукашэнка скарыстаўся не верталётам, а аўтамабілем, каб прыехаць у рэгіён, дзякуючы чаму ўпершыню праехаў па новай трасе, якая злучае Мінск і Магілёў. «Я ехаў, асабліва, дзе лясы (а шмат па дарозе лесу), і думаў: якая прыгожая ў нас краіна! І самае галоўнае, калі ўсе гналіся за вялікімі грашыма (а вялікія грошы — гэта вытворчасць, і ў асноўным шкодная вытворчасць) у свеце, мы ўсё ж такі неяк сваю Беларусь зберагліі, — працягнуў думку пра экалогію Прэзідэнт. — Вельмі хацелася б, каб яна была такая ж чыстая не толькі для нас, але і для нашых дзяцей, для нашых унукаў».

Ён звярнуў увагу, што было б добра, каб і бальніца была ў атачэнні хвойнага лесу, а не жылой забудовы.

Роля псіхалогіі

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў работнікам Магілёўскай абласной клінікі за тое, што яны хутка перакваліфікаваліся. Ён пракаментаваў статыстыку па захваральнасці на «ковід», якой валодае: з 2,5 тысячы апаратаў ШВЛ, што маюцца ў краіне, занятыя каля паўтысячы, каля дзвюх тысяч інфіцыраваных пацыентаў маюць статус «цяжкіх» і гэта колькасць, па яго словах, захоўваецца.

«Ну і самае галоўнае, пнеўманіі — тое, што мы кантралюем, і вы як урачы, мяне зразумееце (я ўжо таксама часткова ўрачом стаў): у нас 20 з паловай — 21 тысяча, можа трошкі больш, але стабілізаваліся недзе на 21 тысячы пнеўманій», — дадаў ён.

Стабілізавалася ў раёне 1800-1900 выпадкаў у суткі і колькасць станоўчых тэстаў на «ковід», канстатаваў беларускі лідар. Ён зноў паўтарыў свой вызначальны тэзіс у гэтай сітуацыі: галоўная задача сістэмы аховы здароўя і дзяржавы — ратаванне жыццяў людзей. Прэзідэнт падкрэсліў асаблівую ролю медыкаў у выратаванні людзей, якія, акрамя інфекцыі, хворыя на цукровы дыябет і іншыя паталогіі, што ўскладняюць барацьбу з вірусам.

«Ну нічога, мы гэта перажывём. Галоўная праблема не гэта. У нас праблем хапае. Яна стала галоўнай таму, што, вы бачыце, асабліва інтэрнэт-прастора ўся запоўненая гвалтам, ды і тэлебачанне наша, звычайныя сродкі масавай інфармацыі, у свеце асабліва. Я яшчэ ў першую хвалю вас папярэджваў, калі вы мяне падкрытыкоўвалі і не разумелі, што мы робім людзей псіхічна ненармальнымі, — напомніў Аляксандр Лукашэнка. — Псіхоз перайшоў у паніку. І нашы людзі вось цяпер паверылі, што не павінна быць панікі».

Гутарка без пасярэднікаў

Падзяка тым, хто штодня змагаецца на бальнічнай перадавой, — галоўная мэта візіту, падкрэсліў Прэзідэнт. Ён закрануў тэму пратэсных настрояў сярод медыкаў: «Урачу няма калі бадзяцца па вуліцах. Асабліва зараз. Урач павінен лячыць. Ёсць у вас прэтэнзіі да ўлады — я да вас прыехаў, давайце прэтэнзіі. Вы — мае выбаршчыкі, давайце прэтэнзіі».

Аляксандр Лукашэнка запэўніў у нязменнасці сваёй пазіцыі: «Давайце будзем жыць дружна, захаваем краіну (а мы яе захаваем, чаго б нам гэта ні каштавала), і зноў — не для мяне, ...гэта ўжо для ўнукаў, нават не для дзяцей, бо нашы дзеці выраслі. І гэта мая галоўная задача».

Усе рашэнні будуць залежаць ад людзей, падкрэсліў Прэзідэнт: «Абяцаю вам: усё будзеце вырашаць вы».

Міністэрства дапаможа

Прэзідэнт апярэдзіў пытанне пра будаўніцтва кардыялагічнага цэнтра: «Мы з міністрам дамовіліся — дапаможам. ...Не ў будаўніцтве, гэта ўжо ваша справа — пабудаваць. Вы правільна зрабілі: пайшлі з шапкай да сялян, да перапрацоўшчыкаў, і яны патроху сабраліся і з энтузіязмам пачалі будаваць гэту бальніцу. Зразумела, што будоўля — гэта, можа быць, чвэрць ад кошту. Галоўнае — высокатэхналагічнае абсталяванне. Ну і мы з міністрам будзем думаць, як вам да заканчэння будаўніцтва дапамагчы з медыцынскім абсталяваннем. Хоць прапрацоўваць асноўнае трэба ўжо цяпер».

У працяг тэмы Прэзідэнт падзяліўся, што мае пэўную насцярожанасць з-за ўхілу надзвычайнай увагі кіраўніка рэгіёна да развіцця сацыяльнай праблематыкі.

«Сацыяльная сфера павінна адпавядаць эканоміцы вобласці», — растлумачыў ён прычыны сваёй заклапочанасці.

Разам з тым Аляксандр Лукашэнка прызнаў, што Магілёў і Брэст, на яго думку, пазней за іншыя абласныя цэнтры атрымалі належную ўвагу ў плане добраўпарадкавання.

Астатняе — за дзяржавай

Беларускі лідар чарговы раз нагадаў, што галоўная задача ўрачоў — лячыць людзей. «Будзе хоць якая капейка — накіруем на ахову здароўя, — паабяцаў ён. — Ваша справа — лячыць людзей, усё астатняе мы забяспечым, як бы складана ні было».

Кіраўнік краіны расказаў, што з 500 мільёнаў долараў, які Еўразійскі банк развіцця даў Беларусі ў крэдыт, прыйшлося 300 мільёнаў выдаткаваць на барацьбу з інфекцыяй падчас другой хвалі каранавіруса. Астатнія грошы пайшлі на выплату за газ.

«Галоўнае — гэта эканоміка, будзе працаваць эканоміка, будзе плён. У гэтым годзе мы не дабяром да 100 працэнтаў ВУП мінулага года зусім мала — 0,5-0,8 працэнта. Ні адна краіна не змагла дадаць, акрамя Кітая, яны больш за 100 працэнтаў ВУП выдадуць. Мы, магчыма, будзем на другім месцы, але гэта не значыць, што ў нас шмат грошай», — заўважыў Прэзідэнт.

Ён запэўніў, што нягледзячы на цяжкасці, краіна захавае сацыяльную арыентаванасць.

Перавагі свайго

Прэзідэнт нагадаў пра тры варыянты барацьбы з каранавірусам з дапамогай вакцынацыі, пра якія казаў напярэдадні ў 4-й бальніцы Мінска — купляць вакцыну, ствараць яе ў Беларусі на аснове расійскага штама і распрацоўваць айчынны аналаг.

Кіраўнік краіны ў размове з медыкамі расказаў, у якую суму абыдзецца распрацоўка айчыннай вакцыны ад каранавіруса.

«Там грошы невялікія, каля 5 мільёнаў рублёў. Гэта менш, чым ваш новы корпус каштуе (кардыялагічны — **«Зв.»**). А справу зробім добрую. Мы акупім гэта, але трэба хутка рухацца ў гэтым кірунку», — заявіў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў: вельмі рады, што нашы вучоныя і спецыялісты замахнуліся на вытворчасць уласнай вакцыны. «Трэба сваю вакцыну распрацаваць. Спецыялісты ёсць, хай і няшмат. Трэба ўзяцца і зрабіць», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Трэба разумець, што каранавірусная інфекцыя нікуды не сыдзе, дадаў ён.

Пытанне вытворчасці айчыннай вакцыны будзе разглядацца ў хуткім часе на адной з нарад у Прэзідэнта.

Марыя ДАДАЛКА,
Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,
г. Магілёў.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Вялікабрытаніі выявілі «хуткасную» версію «ковіда»

Паўднёва-ўсходняя Англія сутыкнулася з новай разнавіднасцю каранавіруса Sars-CoV-2. Як паведаміла са спасылкай на міністра аховы здароўя Вялікабрытаніі Мэцью Хэнкака газета The Guardian, ужо зафіксавана больш за тысячу новых выпадкаў з гэтай разнавіднасцю інфекцыі. Выяўленая ў Вялікабрытаніі новая версія COVID-19 больш заразная. Пра гэта заявіў спецпасланнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя па каранавірусе Дэвід Навара ў эфіры тэлеканала Sky News. Пры гэтым ён адзначыў, што адпаведны від віруса не здаецца небяспечным. «Даныя дазваляюць меркаваць, што гэта радыкальна не зменіць прыярытэты ў барацьбе з вірусам у Злучаным Каралеўстве», — сказаў Навара. Як заўважыў Мэцью Хэнкак, «хуткасная» версія ўжо была заўважана і ў іншых рэгіёнах Еўропы.

У Турцыі на Новы год уводзіцца кругласутачная каменданцкая гадзіна

Прэзідэнт Турцыі Рэджэп Эрдаган заявіў, што з 21.00 31 снежня да 05.00 4 студзеня ўводзіцца кругласутачная каменданцкая гадзіна, паведаміла PIA «Навіны». Адпаведнае рашэнне было прынята па выніках пасяджэння ўрада. Раней у Турцыі была ўведзена начная каменданцкая гадзіна — у будні з 21.00 да 5.00, а таксама кругласутачная — з вечара пятніцы да раніцы панядзелка. Акрамя таго, забаронена работа саўн, басейнаў, спартзалаў. Гандлёвыя цэнтры пускаюць вызначаную колькасць пакупнікоў і толькі па лічбавым кодзе, а рэстараны і кафэ працуюць толькі на вынас.

Навукоўцы мяркуюць, што старажытныя людзі ўпадалі ў спячку

Старажытныя людзі, якія жылі на тэрыторыі Еўропы паўмільёна гадоў таму, маглі выпрацаваць выдатную стратэгію выжывання падчас доўгіх зім ледавіковага перыяду — не выключана, што яны ўпадалі ў спячку. На гэтую думку антраполага Антоніса Барцыокаса з Універсітэта Фракіі імя Дэмакрыта навялі шматлікія астанкі гамінідаў у пячорах Сіма дэ лос Уэсас на поўначы Іспаніі. Гэтыя пячоры сталі адной з самых важных крыніц інфармацыі пры вывучэнні эвалюцыі чалавека. Там было выяўлена больш за 7500 фрагментаў костак, якія належалі па меншай меры 29 старажытным людзям, якіх часта адносяць да віду Homo heidelbergensis — Чалавек гейдэльбергскі. Па словах Барцыокаса, гэтыя астанкі маюць прыкметы цэлага шэрагу захворванняў, якія часта адзначаюцца ў жывёл, якія ўпадаюць у спячку ў пячорах. Таму не выключана, як мяркуе даследчык, што на самым халодным этапе ледавіковага перыяду гамініды вымушаны былі анатамічна адаптавацца і на працягу 50 тысяч гадоў кожную зіму ўпадаць у працяглую спячку.



ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ

Гомельшчына далучылася да рэспубліканскага патрыятычнага праекта.

На працягу двух тыдняў ва ўсіх раёнах рэгіёна будуць арганізаваны дыялогі пакаленняў і мітынгі-рэквіемы. Так, у аграгарадку Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна адбыўся першы ў вобласці дыялог пакаленняў «Памяць сэрца». Абмеркавалі пытанні патрыятычнага выхавання моладзі і захавання памяці аб вялікім подзвігу народа. Акрамя таго, удзельнікі праекта правялі мітынг-рэквіем на тэрыторыі ўнікальнага помніка «Дзецям — ахвярам вайны». Гэта адзіны падобны мемарыяльны комплекс на тэрыторыі СНД. У гады Вялікай Айчыннай вайны менавіта тут, у Чырвоным Беразе, гітлераўцы стварылі зборны пункт для дзяцей ва ўзросце ад 8 да

Фота БелТА.

14 гадоў. Тады ў Германію было гвалтоўна вывезена 1990 дзяцей.

Праект «Памяць сэрца» заклікае звярнуць увагу на важнасць развіцця нацыянальнай і грамадзянскай самасвядомасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі, фарміравання павагі да гісторыі свайго народа і недапушчэння гераізацыі нацызму.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Напярэдадні

«КАЛЮЧЫХ» ХОПІЦЬ УСІМ

Да сімвала свята — з адказнасцю

У найбліжэйшы час плануецца рэалізаваць не менш за 150 тысяч навагодніх дрэўцаў на продаж. Аб гэтым расказаў начальнік аддзела рэалізацыі лесапрадукцыі Міністэрства лясной гаспадаркі Віталь БАНДАРЭВІЧ.

— На сёння арганізавана больш за 1,1 тысячы гандлёвых пляцовак, дзе можна набыць нашу прадукцыю. Елачныя базары будуць працаваць ва ўсіх абласных і раённых цэнтрах, на тэрыторыях лясгасаў і лясніцтваў. Гандлёвыя пункты ў Брэсцкай і Віцебскай абласцях адкрыюцца ўжо з 19 снежня, у Гродзенскай — з 20 снежня, у Мінскай — з 21 снежня, у Гомельскай і Магілёўскай — з 23 снежня. Асартымент навагодніх елак з кожным годам пашыраецца. У мінулым годзе да асноўных пазіцый — елкі еўрапейскай, елкі калючай і хвоі звычайнай — дадалася сербская елка, а сёлета — піхта Нордмана. Цэны на такіх прыгажунь невысокія. На гандлёвым пункце за метровую елку запросяць каля 10 рублёў, у лясніцтве яе можна набыць за 7—9 рублёў. У кадках цэны за елкі трымаюцца ад 12 рублёў да 65 рублёў у залежнасці ад віду прадукцыі і яе вышыні. У Мінску дрэвы па дзяржаўных цэнах можна будзе набыць толькі ў Мінскім лясгасе (вуліца Багратыёна, 70), а таксама на елачным кірмашы (вуліца Прытыцкага, 146), гандляваць прадукцыяй там будзе Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр. У населеных пунктах з колькасцю жыхароў больш за 30 тысяч дрэвы будуць прадаваць у кадках. Пры гэтым кожнаму пакупніку падораць інструкцыю па доглядзе за дрэвам.

Па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі традыцыйна будзе праведзена рэспубліканская акцыя «Захаваем сімвал свята». Лясгасы і Рэспубліканскі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр прапануюць купіць навагоднія дрэвы ў кадках, гаршках ці скрынях, каб затым захаваць іх да вясны, напрыклад, на балконе або дачы, і высадзіць у найбліжэйшым лясніцтве. Акрамя таго, пасля свят любы ахвотны зможа вярнуць дрэвы ў лясніцтвы для далейшай перапрацоўкі, такім чынам падтрымаць добраўпарадкаванне сваёй малой радзімы і паўдзельнічаць у захаванні прыродных рэсурсаў планеты.

Начальнік упраўлення лясной гаспадаркі Міністэрства лясной гаспадаркі Сяргей ЧАРНЯЎСКІ расказаў, што з 18 снежня ў мэтах эфектыўнай аховы лясоў і спынення магчымых правапарушэнняў у тым ліку сумесна з Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і раслiннага свету, міністэрствамі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і ўнутраных спраў будуць праведзены рэйдавыя мерапрыемствы.

— Для спынення незаконнай нарыхтоўкі навагодніх елак, а таксама іх транспарціроўкі на аўтадарогах будуць выстаўлены пасты, — каля 300 па ўсёй краіне. На сёння ў нас актыўна выкарыстоўваюцца сродкі фота- і відэафіксацыі, у сістэме Міністэрства лясной гаспадаркі закуплена больш за тысячу фотапастак, яны паказалі сваю эфектыўнасць. Гэтыя прылады ўстаноўлены ў месцах канцэнтрацыі іглістых маладнякоў, вакол населеных пунктаў, садовых таварыстваў, уздоўж аўтадарог. З пачатку года з выкарыстаннем сродкаў фотафіксацыі было выяўлена больш за 600 парушальнікаў, з кожным годам іх колькасць змяншаецца.

Фотапасткі ўстанаўліваюцца для арганізацыі відэаназірання ў лясным фондзе, іх размяшчэнне перыядычна мяняюць. Камеры працуюць у анлайн-рэжыме, імгненна перадаючы здымкі на мабільны тэлефон, што дазваляе дзяржаўнай лясной аховe аператыўна рэагаваць на парушэнні і неадкладна прымаць меры. Такія прылады могуць доўгі час працаваць у аўтаномным рэжыме, іх камеры дазваляюць ідэнтыфікаваць асобу парушальніка і рэгістрацыйны нумар аўтамабіля.

Сяргей Чарняўскі нагадаў, што за незаконна ссечанае навагоднее дрэва наступае адміністрацыйнае пакаранне. «Кодэкс праду гледжвае штрафныя санкцыі за такія дзеянні ў прыродаахоўных, рэкрэацыйна-аздараўленчых і ахоўных лясах ад 5 да 50 базавых велічынь, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад 20 да 200, на юрыдычную асобу — ад 50 да 300 базавых. У эксплуатацыйных лясах штрафы складуць на фізічную асобу да 30 базавых, на індывідуальнага прадпрымальніка — ад 10 да 150, на юрыдычную асобу — ад 20 да 200 базавых. Пры гэтым парушальнік абавязаны пакрыць нанесеную навакольнаму асяроддзю шкоду. Калі незаконна ссечаныя дрэвы атрымалі механічныя пашкоджанні або страцілі эстэтычныя якасці, у сувязі з чым іх немагчыма далучыць да законнай рэалізацыі, у дадатак да сумы штрафу прыйдзецца заплаціць адну базавую велічыню за кожнае дрэва».

Дар'я ШЛАПАКОВА.

Тэхналогіі і гандаль

МАЗ «прыдумаў» продаж тэхнікі бескантактава

Мінскі аўтазавод запусціў бескантактавую дастаўку спецтэхнікі на фоне «другой хвалі» пандэміі. Пра гэта расказалі на прадпрыемстве.

Абсалютна бескантактавая дастаўка дзейнічае пры куплі тэхнікі толькі на тэрыторыі Беларусі. «У нас шмат пакупнікоў у рэгіёнах, і мы хочам, каб яны не траціліі дзень на паездкі і не падвяргалі сваё здароўе рызыцы ў складаных эпідэміялагічных умовах. Калі раней па спецтэхніку трэба было ехаць у збытавы аддзел завода, то цяпер нашы кіроўцы даставяць яе ў любое месца на карце краіны. Акрамя клопату пра здароўе, гэта таксама эканоміць пакупнікам час і грошы», — растлумачыў **начальнік упраўлення продажаў спецыяльнай тэхнікі і шасі ААТ «МАЗ» — кіруючай кампаніі холдынга «БелаўтаМАЗ» Юрый ПІВАВАРАЎ.**

Між іншым, гэты завод апошнім часам дэманструе поспехі ў развіцці спецтэхнікі. Толькі за апошнія месяцы ў кампаніі распрацавалі смеццявоз з гіганцкай «рукой» для заглыбленых кантэйнераў і аўтакран грузападымальнасцю 32 тоны, якому не патрабуецца спецдазвол для язды па звычайных дарогах. Усе навінкі карыстаюцца вялікім попытам на рынку.

Сяргей КУРКАЧ.

Ну і ну!

З'ЕДЗЕНАЕ — НЕ СКРАДЗЕНАЕ?

У аператыўна-дзяжурную службу Ленінскага РАУС Магілёва з заявай звярнуўся прадстаўнік адной з прадуктовых крам па праспекце Міру, які расказаў, што невядомая жанчына выкрала прадукты.

Сапраўды, пасля таго як грамадзянка пабывала каля стэлажоў адтуль знікла некалькі тавараў: замест дзіцячага харчавання, пітной вады, шакаладу і ёгурта на паліцах ляжалі абгорткі ад прадуктаў.

Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Ленінскага РАУС устанавілі жанчыну, якая забірала тавар з сабой не заплаціўшы, а таксама ела яго непасрэдна ў краме. Па інфармацыі УУС Магілёўскага аблвыканкама, падазраванай аказалася 36-гадовая мясцовая жыхарка, якая ўжо не першы раз наведвае гэтую прадуктовую краму. Схаваўшыся сярод стэлажоў, яна ела прадукты, за якія не планавала плаціць, а пасля сыходзіла.

Зараз выкрадзеная маёмасць часткова вернута. У дачыненні да затрыманай распачата крымінальная справа, следчымі дадзена прававая ацэнка.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

18 снежня 2020 г. у 14.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца пасяджэнне чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

Слова — чытачам

«ТРЫМАЦЬ У РУКАХ ГАЗЕТУ МОДНА!»

Глеб ЛАПІЦКІ, генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск» і кіраўнік дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску»:

— Сёння вялікую частку інфармацыі мы можам знайсці ў інтэрнэце, практычна кожны валодае смартфонам ці планшэтам. Аднак, на маю думку, такія друкаваныя сродкі масавай інфармацыі, як «Звязда», будуць па-ранейшаму займаць сваё месца ў інфармацыйнай прасторы, тым больш што ўсе матэрыялы магчыма знайсці і ў анлайне.

Газета ахоплівае шмат тэм, якія цяпер хвалююць грамадства, своечасова іх трансліруе і дае аб'ектыўную ацэнку падзеям.

Мяне ў першую чаргу цікавіць тэма культуры. Вельмі прыемна бачыць побач артыкулы пра Міжнародны форум тэатральнага мастацтва і 100-годдзе з дня нараджэння Андрэя Макаёнка, навіны пра сучасных куміраў моладзі. А самае галоўнае, што ўсе гэтыя матэрыялы актуальныя і цікавыя чытачу. Больш за тое, газета «Звязда» папулярызуе родную мову і даказвае, што валодаць беларускай гэта прэстыжна.

«Звязда» — адзін з нямногіх друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, які захоўвае нашу нацыянальную адметнасць і спрыяе развіццю асобы.

Дзякую камандзе выдавецкага дома за актуальнасць, разнастайнасць і аператыўнасць.

У наш час трымаць газету ў руках модна, тым больш такую, як «Звязда», бо ў сучасным свеце толькі прэстыжныя і папулярныя ў чытачоў выданні здольныя захаваць друкаваны фармат, а не цалкам перайсці ў анлайн.

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота з асабістага архіва Глеба ЛАПІЦКАГА.

Манеты

«Архітэктурная спадчына Беларусі»

Нацыянальны банк краіны з 15 снежня выпусціў у абарачэнне 6 памятных манет серыі «Архітэктура Беларусі»: «Чачэрская ратуша», «Касцёл бернардзінцаў. Будслаў», «Барысаглебская царква. Гродна», «Касцёл Яна Хрысціцеля. Камаі», «Косаўскі палац», «Будынак гарадскога тэатра. Магілёў». Манеты наміналам 2 рублі дыяметрам 23,50 мм выраблены са сталі, пакрытай меддзю і латунню (кальцо), і сталі, пакрытай меддзю і нікелем (сярэдзіна), масай 5,81 г, накладам 25 000 штук кожнага наймення.

Манеты маюць форму круга, з пярэдняга і адваротнага бакоў — кант, які выступае па акружнасці. Бакавая паверхня манет — з паўтаральным надпісам «БЕЛАРУСЬ» і элементамі нацыянальнага арнаменту.

Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам нашай краіны і абавязковыя да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў.

Сяргей КУРКАЧ.

Калектыў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне начальніку галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Сазонавай Вользе Уладзіміраўне ў сувязі з незаменнай стратай, якая напаткала яе сям'ю, — смерцю МАЦІ.

Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» глыбока смуткуе з прычыны смерці былога шматгадовага галоўнага рэдактара часопіса «Работніца і сялянка» («Алеся») Марыі Іосіфаўны КАРПЕНКІ і выказвае шчырыя спачуванні яе родным і блізкім.

Вопыт

ШКОЛЬНЫ «ЗАКОН»

У навучальных установах Гомельшчыны пачалася ўстаноўка адмысловага абсталявання, якое на 99 % ачышчае паветра ад бактэрый і вірусаў. Так, выкарыстанне бактэрыцыдных рэцыркулятараў дапаможа адчувальна паменшыць рызыку ўзнікнення інфекцыйных захворванняў сярод навучэнцаў і педагогаў.

Між тым ва ўсіх школах рэгіёна пад жорсткім кантролем правядзенне абавязковага «фільтра здароўя» супрацоўнікаў і вучняў.

Напрыклад, у 11-й сярэдняй школе абласнога цэнтра, каб трапіць у будынак, перад пачаткам заняткаў неабходна абавязкова прайсці так званы ранішні фільтр. Для вучняў гэта візуальны кантроль самаадчування, для настаўнікаў — бескантактная тэрмаметрыя. Пры гэтым усе дарослыя ў навучальнай установе павінны абавязкова знаходзіцца ў абарончых масках. У школе ў якасці супрацьэпідэмічнага новаўвядзення — работа бактэрыцыдных рэцыркулятараў. Гэтае абсталяванне запавольвае тэмп размнажэння мікробаў, правакуе гібель віруса. Падобныя прылады абсалютна бяспечныя для дзяцей.

Пакуль у 11-й школе за ўласныя сродкі набылі тры такія ўстаноўкі. Яны знаходзяцца на ўваходзе ва ўстанову, у сталовай і настаўніцкай. З цягам часу ў школе плануецца паставіць яшчэ тры такія прылады на кожным паверсе. Галоўная мэта супрацьэпідэмічнага новаўвядзення — знізіць рызыку захворвання ў калектыве.

Прынамсі, у школе выпрацавалі ўласны супрацьэпідэмічны план мерапрыемстваў, узяўшы за аснову рэкамендацыі Міністэрства аховы здароўя і Гомельскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.

— У першую чаргу значная ўвага надаецца санітарна-гігіенічнаму стану, які мы імкнёмся падтрымліваць на належным прафілактычным узроўні. Гэта вільготная прыборка кожныя дзве гадзіны, а калі патрэбна, то і штогадзінна; гэта генеральныя штотыднёвыя прыборкі, а таксама абавязковае тэрміновае праветрыванне класаў. Важны блок — інфармацыйная работа, якую мы праводзім як з вучнямі, так і бацькамі, — адзначае **дырэктар ДУА «СШ № 11 г. Гомеля» Наталля ЛІТВІНАВА.**

Між тым неабходнасці насіць маскі ў школе няма. Імі тут карыстаюцца каля 10 % школьнікаў, але ўсе на працягу дня выкарыстоўваюць дэзсродкі. Для педагогаў нашэнне абарончай маскі — абавязковае патрабаванне. Гэта датычыцца і ўсіх супрацоўнікаў навучальнай установы, якія напрамую не кантактуюць з вучнямі.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Парады бывалых

ПРЫНЦЫПОВА НОВЫЯ АДЧУВАННІ

Гісторыі людзей, якія перахварэлі на COVID-19 і паправіліся

Зараз у сеціве з'явілася нямала разважанняў, парад ад медыкаў і не толькі наконт таго, як лячыцца ад «ковіда», як пераадольваць наступствы хваробы, чаго баяцца, а на што не звяртаць увагі. Часам гэтыя выказванні супярэчаць адно аднаму, часам насцярожваюць. Аптымізм усяляе хіба тое, што большасць людзей усё ж пераносіць хваробу няцяжка альбо не асабліва цяжка і адносна добра аднаўляецца. Прынамсі, мяркуйце самі. Вось тры гісторыі жанчын розных узростаў, у якіх лабараторна быў пацверджаны «ковід».

Вікторыя Сачко (Брэст), 61 год:

— Захварэла ў канцы вясны. Апошнім часам я працавала рабочай кухні ў супермаркеце. У нас ніхто не хварэў у калектыве. А ў мужа на рабоце — амаль увесь аддзел. Ён быў дома пэўны час як кантакт першага ўзроўню. Але ніякіх сімптомаў у яго не з'явілася, тэст быў адмоўны. І ўсё ж я думаю, што ён прынёс вірус, хоць, вядома, гэта толькі меркаванне. Я адчула першыя прыкметы не зусім тыпова, калі можна так сказаць. Ныла ў вобласці сэрца, было проста цяжка нагнуцца і ўстаць, паднесці нешта. А прыкмет прастуды, як у большасці людзей, не было — гэта і прытупіла пільнасць. Я хадзіла на работу, пачала піць вітаміны і... страціла час. Потым засталася дома, думала адляжацца, але з'явілася задышка, прапала адчуванне паху. Былі выхадныя, вырашыла ў панядзелак выклікаць урача. Ды ў нядзелю вечарам муж і сын выклікалі «хуткую». Мяне адразу завезлі ў бальніцу. Абследаванне паказала двухбаковую пнеўманію, якую ніяк не маглі ўтаймаваць. Мне тры разы мянялі антыбіётыкі, нічога не дапамагала, стан пагаршаўся. На некалькі дзён забіралі ў рэанімацыю. Праўда, да апарата штучнай вентыляцыі лёгкіх справа не дайшла, падтрымлівалі кіслародам ды рознымі лекамі. Потым зноў перавялі ў аддзяленне. Але да пнеўманіі дабавіўся проста жудасны дысбактэрыёз. Відаць, арганізм даў такую рэакцыю на антыбіётыкі. І гэта аказалася самае цяжкае. Есці фактычна не магла.

У бальніцы прабыла амаль месяц і сама папрасілася дадому. Дома спрабавала наладзіць харчаванне самастойна. Ела па лыжцы ёгурту і кавалку банана з напарстак, але адчула, што не спраўляюся, і зноў папрасілася ў бальніцу. Аб магчымасці новай шпіталізацыі мне гаварылі адразу. На гэты раз прабыла дзесяць дзён і выпісалася з цвёрдым намерам выкараскацца. Мне склалі падрабязную інструкцыю па харчаванні, якой прытрымлівалася. Але есці нармальна не магла доўга. Уявіце сабе: за два месяцы я скінула 12 кілаграмаў, хоць і да гэтага не была поўная. Акрамя непрымання ежы, дабавілася аграмадная слабасць. Калі я з пакоя прыходзіла ў кухню, трэба было адразу адпачываць. А мне ж хацелася што-небудзь зрабіць, я не прывыкла сядзець склаўшы рукі. Потым, недзе ў ліпені, родныя ледзь не прымусам завезлі мяне на дачу. І гэта пайшло на карысць, я стала дыхаць чыстым паветрам і паціху пайшла на папраўку. Пасля бальнічнага я ўзяла чарговы водпуск, потым месяц за свой кошт, таму што фізічна працаваць не магла. Ну а ўрэшце пайшла на пенсію. Цяпер, думаю, было б здароўе, а нейкую падпрацоўку знайду, калі будзе здароўе. Для гэтага перагледзела лад жыцця. Харчаванне працэнтаў на 80 ля сям'і зрабіла здаровым, шмат гуляю на свежым паветры.

Парада: калі адчулі прыкметы хваробы, не праводзьце эксперыменты над сабой, не думайце адляжацца дома з вітамінамі, звяртайцеся па дапамогу. І яшчэ: ні ў якім разе не панікуйце, старайцеся мабілізаваць сілы на барацьбу з хваробай.

Вольга Васілюк, настаўніца пачатковых класаў СШ № 35 (Брэст), 37 гадоў:

— У лістападзе я была далёка не першай з педагогаў нашай школы, хто захварэў. У маім класе дзеці хварэлі, ды і мае (адзін ходзіць у школу, другі — у садок) тэарэтычна маглі стаць пераносчыкамі інфекцыі. Крыху больш за месяц таму я прыйшла з работы і адчула сябе вельмі дрэнна. Не было высокай тэмпературы, але ж пачало нібы выварочваць. Пайшла ў паліклініку, урач адразу прызначыла прэпараты супраць вірусаў і курс антыбіётыкаў. А дома вечарам стала яшчэ горш. Назаўтра з пасцелі не ўстала, урача выклікала дадому, мне адкрылі ліст непрацаздольнасці. Пазней зрабілі тэст, і ўжо назіраць мяне прыязджалі інфекцыяністы. Тэмпература трымалася крыху больш за тыдзень, але не асабліва высокая. Нічога падобнага раней у жыцці я не перажывала. Тое, што называюць ламотай пры грыпе, прыняло нейкія крайнія формы, калі цябе, паводле адчуванняў, разрывае на часткі. Сказаць, што балела галава і сохла ў роце, — гэта амаль нічога не сказаць. Галава проста гудзела, ніякія таблеткі не дапамагалі, а язык так прысыхаў, што варушыць ім было немагчыма, пакуль не зробіш глыток вады. Скура стала настолькі адчувальнай, што любы рэзкі дотык прычыняў боль. Прапалі нюх і адчуванне смаку. Пра першае мы часткова ведаем па звычайным насмарку. А вось калі і хлеб, і апельсін, і салёны гурок, і мяса аднолькава нагадваюць кардон — гэта прынцыпова новыя адчуванні. Але ж есці першыя дні хваробы не тое што не хацелася — было проста немагчыма. Даводзілася толькі шмат піць. Гэта ж раяць і ўрачы.

Хрыпы ў мяне не праслухоўваліся, думаю, нашы ўрачы ўжо навучыліся часткова вызначаць пнеўманію без здымкаў і камп'ютарнай тамаграфіі. Флюараграфію я рабіла ў жніўні, таму мне яе не прызначылі. І недзе праз тыдзень стала адпускаць па ўсіх кірунках. Паступова з'явіўся смак, потым — нюх, задышка стала меншай, менш балела ў грудзях.

Кардыёмагніл я прызначыла сабе сама і, калі пачала піць, стала адчувальна лепш. Хоць нікому не раю гэта рабіць без рэкамендацыі доктара. Сама буду раіцца з участковым урачом наконт таго, ці прымаць мне яго далей. На бальнічным я прабыла 15 дзён і ўжо два тыдні працую. У першыя дні на работу я хаджу пехатой (адлегласць прыкладна як адзін аўтобусны прыпынак), ішла ўдвая даўжэй за звычайнае. Па дарозе дадому разы два даводзілася спыняцца і адпачываць.

Цяпер, на шчасце, стан амаль стабілізаваўся, адчуваю сябе нядрэнна. Праз паўмесяца планавае абследаванне. Аб усім буду раіцца з урачом. Дзеці мае былі пры мне, але не захварэлі альбо перанеслі хваробу бессімптомна.

Парада: гэтую хваробу трэба вылежаць, асабліва ў першыя дні. Пастарайцеся загадзя прапіць вітаміны для падтрымкі арганізма. Вучыцеся ляжаць на жываце, хто не ўмее. Можа спатрэбіцца.

Кацярына Юрчык, студэнтка БНТУ (Баранавічы), 22 гады:

— Зараз вучуся дыстанцыйна, таму знаходжуся дома. Першай у нас захварэла мама, яна працуе ў дзіцячым садку. Ну а за ёй па чарзе — уся сям'я, я стала апошняй. Можна сказаць, я перахварэла лёгка, усяго чатыры дні доўжылася недамаганне. У першы дзень страшэнна балелі вочы, нельга было іх падняць, рухаць імі. Усё астатняе можна было трываць. Але я хутка пайшла на папраўку, нюх і смак у мяне не прападалі. А вось мой 68-гадовы дзядуля, які жыве асобна, хварэў раней двухбаковай пнеўманіяй, да гэтай пары адчувае слабасць і вельмі павольна аднаўляецца.

Парада: беражыце сябе і асабліва беражыце пажылых родных: ім даводзіцца цяжэй за іншых.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Прозвішча першай суразмоўніцы зменена па яе просьбе.

ГІСТОРЫЯ ЦАЦАК

Як змянялася наша ёлка?

Гістарычны лёс краіны можа быць запісаны не толькі словамі на паперы. Часам гісторыю можна «прачытаць» у самых нечаканых рэчах. Напрыклад, у ёлачных цацках.

У снежні ў Доме-музеі першага з'езда РСДРП працуе выстаўка савецкіх ёлачных цацак. Некаторыя з гэтых навагодніх аздабленняў, напэўна, памятаюць тыя, каму цяпер за трыццаць. А можа быць, такія цацкі яшчэ ёсць у вашых бабуль і дзядуляў? Дарэчы, усе экспанаты — больш за 700 цацак — з прыватнай калекцыі. Іх сабрала калекцыянер з Бабруйска Галіна Жук.

Серыя цацак па казцы «Доктар Айбаліт».

ТЭХНАЛОГІІ І МАТЭРЫЯЛЫ

У 1930—1940-я гады шкляныя цацкі былі яшчэ раскошай — далёка не кожнаму па кішэні. Часцей выкарыстоўваліся ёлачныя аздабленні, якія ўяўлялі сабой фігуркі са скручанай прэсаванай ваты, размаляваныя фарбамі і пакрытыя крухмальным клейстарам, пасыпаным зіхатлівым шкляным «снегам». Яны выпускаліся да сярэдзіны 1950-х. Кожная такая фігурка была ручной работы, тэхналогію вырабу ватнай цацкі механізаваць так і не ўдалося, расказалі ў музеі. У пяцідзясятых ватная цацка знікла з прылаўкаў магазінаў.

Яшчэ адна папулярная тэхналогія вытворчасці ёлачных аздабленняў сярэдзіны мінулага стагоддзя — «картанаж». Цацкі рабіліся з кардону, абклеенага бронзавай або алюмініевай паперай. Дзве палавінкі фігуркі штампавалі ў металічнай форме і склейвалі. Размалёўвалі цацку пры дапамозе пульверызатара, а дробныя дэталі прамалёўваліся ўручную.

Ёсць у калекцыі і сапраўды ўнікальныя экспанаты — шкляныя ёлачныя цацкі, пакрытыя каляровым лакам па метадзе Глінкі. Сёння такіх аздабленняў ужо практычна не засталося ў бабуліных скрынях і ў калекцыянераў. Іх наогул было выпушчана нямнога — вытворчасць была спынена з-за працаёмкасці працэсу. Метад заключаўся ў тым, што цацку змяшчалі ў раствор гліны, высушвалі, а пасля надрапвалі малюнак. Астатняя частка гліны выдалялася. Вычышчаныя месцы апрацоўваліся серабром і пакрываліся каляровым лакам.

У цэлым на паток вытворчасць ёлачных цацак была пастаўлена толькі ў канцы 1960-х, і ў выніку, зразумела, знізіліся іх разнастайнасць і эстэтычныя характарыстыкі. Да гэтага ўсе навагоднія аздабленні былі хэнд-мэйдам.

У канцы 1950-х — пачатку 1960-х савецкая прамысловасць засвоіла выпуск цацак-прышчэпак. Звяры, птушкі, клоўны, казачныя персанажы, ялінкі на прышчэпках карысталіся велізарным попытам. Яшчэ адна навагодняя памяць мінулага стагоддзя — наборныя цацкі з дроту і шклярусу. З 1940-х да 1950-х амаль у кожным доме былі ёлачныя аздабленні са шкляных трубачак і пацерак, нанізаных на нітку, а пазней — на тоненькі дрот. Такія рознакаляровыя цацкі і ёлачныя карáлі можна бачыць нават у савецкіх фільмах тых часоў, калі па сюжэце гаворка ішла аб Новым годзе.

Ёлачная вярхушка «Чырвоная зорка» — адно з самых першых савецкіх ёлачных аздабленняў. У 1960-х яна трохі здала пазіцыі: Гагарын паляцеў у космас, і ёлачную зорку ўсё часцей сталі замяняць «пікай», падобнай на ракету, якая ўзлятае. Вытворчасць цацак стала больш тэхналагічная: на прылаўках з'явіліся шары з фігурнымі выемкамі, рознакаляровым «інеем», пакрытыя фарбай, што свеціцца ў цемры, у форме пірамідак, шышачак і ледзяшоў.

«Дожджык» з металічнай фольгі, традыцыйнае для нашай краіны ёлачнае аздабленне, «родам» з пачатку 1970-х. Тады ён быў у модзе, ім часта злоўжывалі, цалкам завешваючы ёлку. Прыкладна тады ж з'яўляюцца ёлачныя цацкі фармату «міні». Мініяцюрныя фігуркі прызначаліся для ўпрыгожвання маленькіх настольных ёлачак.

ТЭМЫ І МАТЫВЫ

Першыя савецкія ёлачныя цацкі выпускаліся ў форме зорак, фігурак чырвонаармейцаў, парашутыстаў. Крыху пазней дадалася тэматыка асваення Поўначы — палярнікі, самалёцікі і белыя мядзведзі. Яшчэ адным тэматычным блокам ёлачных цацак тых часоў былі цыркавыя артысты — клоўны, слоны, сабачкі, мядзведзі. У 1937 годзе ў якасці ёлачных аздабленняў сталі актыўна выпускацца фігуркі Снягурак.

Пачатак 1940-х адзначыўся серыяй ёлачных цацак — герояў казак: Іван Царэвіч, Кот у ботах, Чырвоная Шапачка, Доктар Айбаліт і яго памочнікі, Аладзін і Хатабыч. У 1949-м, у гонар юбілею Пушкіна, з'явіліся на ёлках і пушкінскія казачныя персанажы. А ў пачатку 1950-х — героі казак «Чыпаліна», «Бураціна». Неўзабаве выходзіць у продаж і серыя ёлачных цацак «Пятнаццаць рэспублік — пятнаццаць сясцёр»: фігуркі дзяўчат у нацыянальных касцюмах сімвалізавалі адзінства народаў Савецкага Саюза.

У сярэдзіне 1950-х, у часы Хрушчова, у моду ў вытворцаў ёлачных аздабленняў уваходзіць сельскагаспадарчая тэматыка. На ёлках красуюцца лімоны і памідоры, агуркі і вінаград, слівы і персікі, яблыкі і царыца палёў — кукуруза. Дарэчы, з усяго гэтага багацця толькі кукуруза выпускалася аж да развалу Савецкага Саюза.

У 1960-х у тэматыцы ёлачных цацак лідзіруюць касмічныя матывы: ракеты і касманаўты. У 1970-х пераважная тэма — героі савецкіх мультфільмаў, ад Карлсана да Віні-Пуха. А ў канцы 70-х — пачатку 80-х папулярнай стала вясковая тэма — менавіта тады былі выпушчаныя памятныя для многіх сімпатычныя заснежаныя домікі. Яшчэ адна тэндэнцыя 80-х — ёлачныя цацкі-званочкі. Менавіта тады ў моду ўвайшло ўпрыгожванне ёлкі ў адной колеравай гаме, калі ўсе фігуркі падбіраліся ў пэўным колеры. Тэндэнцыя, дарэчы, нікуды не сышла і ў нашы дні: цяпер гэта называецца «офісны», або «еўрапейскі», стыль у дэкоры ёлкі.

Серыя цацак па казцы «Аладзін».

Папулярная тэхналогія вытворчасці ёлачных аздабленняў сярэдзіны мінулага стагоддзя — «картанаж».

ДЫЗАЙНЕРСКІ ПАДЫХОД

Калі ў вас захаваліся старыя савецкія цацкі — тэрмінова даставайце іх, бо заступнік новага года па ўсходнім календары Бык — ашчадны, упарты і трохі рэтраград. А значыць, вінтажны стыль упрыгожвання ёлкі актуальны як ніколі: такая ёлачка дадасць адчування дабрабыту і патрыярхальнасці вашаму дому, і Быку гэта па душы. У якасці аздабленняў выкарыстоўвайце старыя цацкі. Іх сапраўды яшчэ можна знайсці ў бабуліным куфры, а можна набыць на блышыным рынку або анлайн-барахолках, купіць у мастацкім салоне, а пры некаторым спрыце і навыках — нават зрабіць самастойна.

Таксама блізкі заступніку года так званы славянскі стыль упрыгожвання ёлкі. Цацкі могуць быць сучасныя, але прынцып іх размяшчэння — той, як навагоднюю прыгажуню ўбіралі нашы бабулі: большыя цацкі — на ніжнія галіны, драбнейшыя — вышэй. На верхавіну — вядома, зорку (можна шпіль). Гірлянда з лямпачак, «дожджыку», серпанціну. Пад ёлкай — фігуркі Дзеда Мароза і Снягуркі, Снегавік і «снег» з ваты. Аздоблены разнастайнымі цацкамі, галоўны навагодні сімвал атрымліваецца страката і не вельмі стыльны, затое душэўны і мілы.

Яшчэ адзін стыль упрыгожвання ёлкі, які спадабаецца заступніку года, — цацкі з натуральных матэрыялаў у экастылі. «Дожджыку», мішуры і светлавых гірлянд гэты стыль не любіць. Для творчых натур падыдзе модны мінімалістычны стыль. Для ўпрыгожвання New Year tree ў такім стылі цацкі практычна не выкарыстоўваюцца. Прымяняюцца ў асноўным каляровыя спрэі ці проста лак для валасоў з бліскаўкамі. Гэтыя сродкі распыляюць па галінках зверху ўніз і даюць высахнуць. Наступны крок — паставіць пад ёлку каляровы ліхтар, накіраваўшы ўверх прамень святла.

Зрэшты, не пакрыўдзіцца заступнік года, калі вы ўпрыгожыце ёлку ў еўрапейскім стылі. Галоўнае — выбраць правільныя колеры. Еўрапейскі стыль дэкору ёлкі мы ўсе бачылі ў афіцыйных інтэр'ерах, але цікава і стыльна такая ёлка будзе выглядаць і дома. Для такога стылю характэрна выкарыстанне цацак адной формы і памеру (звычайна гэта шары), двух кантрасных колераў, якія спалучаюцца паміж сабой, або двух адценняў аднаго колеру. Выдатна выглядае аздабленне ёлкі цацкамі аднаго колеру і адцення, але рознай фактуры: матавымі і бліскучымі. Гірлянда з ліхтарыкаў прадугледжвае вельмі дробныя лямпачкі. А «дожджык» і мішура пры ўпрыгожванні ёлкі ў гэтым стылі не патрэбныя. Але можна выкарыстоўваць банцікі і стужкі з парчы аднаго колеру з цацкамі. Сёлета навагоднія колеры па ўсходнім гараскопе — белы, «металік» і блізкія да іх шэры і серабрысты, а таксама ўсе адценні зялёнага.

Навагодняя памяць мінулага стагоддзя — наборныя цацкі з дроту і шклярусу.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Навагоднія паштоўкі савецкіх часоў.

Тэндэнцыі

Прыезджым плацяць менш

У многіх краінах з высокім узроўнем даходаў расце разрыў у аплаце працы мігрантаў і мясцовых работнікаў

За апошнія пяць гадоў у шэрагу краін з высокім узроўнем даходаў разрыў у аплаце працы мігрантаў і мясцовых работнікаў павялічыўся, гаворыцца ў новым дакладзе, падрыхтаваным Міжнароднай арганізацыяй працы (МАП). Так, у Італіі, паводле апошніх звестак, працоўныя мігранты атрымліваюць на 30 % менш мясцовых грамадзян, у той час як у 2015 годзе гэты паказчык складаў 27 %.

НАЙЧАСЦЕЙ — ВЫПАДКОВАЯ ПРАЦА

У шэрагу краін, такіх як Кіпр, Італія ці Аўстрыя, разрыў у аплаце працы паміж мігрантамі і мясцовымі работнікамі яшчэ вышэйшы: 42, 30 і 25 % адпаведна. У Фінляндыі ён ніжэйшы за сярэдні і складае 11 %, а ў Еўрапейскім Саюзе ў цэлым — амаль 9 %.

Разам з тым, як паказвае даследаванне МАП, з праблемамі дыскрымінацыі і адчужэння мігранты сутыкаюцца ва ўсіх краінах, і пандэмія COVID-19 толькі пагоршыла сітуацыю.

У дакладзе адзначаецца, што ў краінах з высокім узроўнем даходаў мігранты часцей задавольваюцца выпадковай працай. 27 % з іх працуе на падставе часовых кантрактаў, 15 % — на ўмовах няпоўнага працоўнага часу. Яны непрапарцыянальна прадстаўлены ў так званым першасным сектары эканомікі — сельскай гаспадарцы, рыбалоўстве, лясной гаспадарцы — і займаюць больш, чым мясцовыя грамадзяне, працоўных месцаў у другасным сектары: горнарудная справе, апрацоўчай прамысловасці, электра-, газа- і водазабеспячэнні, а таксама ў будаўніцтве.

«Працоўныя мігранты на рынку працы нярэдка сутыкаюцца з няроўнасцю абыходжання, у тым ліку ў тым, што датычыцца аплаты працы, доступу да працаўладкавання і прафесійнай падрыхтоўкі, умоў працы, сацыяльнага забеспячэння і прафсаюзных правоў. Між тым у эканоміцы многіх краін яны іграюць асноватворную ролю і не могуць лічыцца грамадзянамі другога гатунку», — кажа **кіраўнік аддзела працоўнай міграцыі МАП Мішэль ЛЕЙТОН.**

НЕАДПАВЕДНАСЦЬ ПРАЦОЎНЫХ НАВЫКАЎ

Працоўныя мігранты зарабляюць менш, чым мясцовыя грамадзяне, якія маюць такую ж, як у іх, кваліфікацыю і якія адносяцца да той жа прафесійнай катэгорыі. Яны часцей, чым мясцовыя, займаюцца некваліфікаванай і нізкааплатнай працай, якая не адпавядае ўзроўню іх адукацыі і навыкаў. Высокаадукаваныя працоўныя мігранты ў краінах з высокім узроўнем даходаў маюць таксама менш шанцаў атрымаць працу высокай прафесійнай катэгорыі.

Так, у Злучаных Штатах і Фінляндыі, дзе сярод працоўных мігрантаў людзі з сярэдняй адукацыяй складаюць адпаведна 78 і 98 %, доля мігрантаў, занятых высока- або сярэднекваліфікаванай працай, складае ўсяго 35 і 50 %. Гэта сведчыць аб тым, што мігрантам цяжка знайсці прымяненне сваім навыкам і вопыту ў іншых краінах — шмат у чым з-за адсутнасці сістэмы прызнання навыкаў і кваліфікацыі мігрантаў.

ПРАЦОЎНЫЯ МІГРАНТЫ-ЖАНЧЫНЫ ПАДВЯРГАЮЦЦА ДВАЙНОЙ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ

Мігранты-жанчыны губляюць у заробку ўдвая: і як мігранты, і як жанчыны. Разрыў у аплаце працы паміж мясцовымі мужчынамі і жанчынамі-мігрантамі ў краінах з высокім узроўнем даходаў ацэньваецца ў 21 % у гадзіну. Гэта вышэй гендарнага разрыву ў аплаце працы (16 %) у тых жа краінах.

Збольшага гэта тлумачыцца тым, што жанчыны-мігранты складаюць істотную частку тых, хто займаецца хатняй працай, а менавіта 73 % (8,45 млн) усіх хатніх работнікаў-мігрантаў у свеце. У краінах з высокім узроўнем даходаў разрыў у аплаце працы паміж мігрантамі і мясцовымі работнікамі ў сферы дагляду складае каля 19 %.

НАСТУПСТВЫ ПАНДЭМІІ

Як у плане здароўя, так і ў эканамічным плане на становішчы працоўных мігрантаў пандэмія адбілася мацней, чым на астатніх катэгорыях работнікаў. На пачатковым этапе крызісу, звязанага з COVID-19, дзясяткі мільёнаў працоўных мігрантаў пазбавіліся працы і былі вымушаныя вярнуцца на радзіму.

Мігрантам пры іх родзе дзейнасці цяжэй перайсці на аддалены рэжым, чым мясцовым грамадзянам, да таго ж многія з іх занятыя сацыяльнай працай і больш нетрывалыя перад вірусам.

У карткі самы вялікі вораг — доўгі язык кліента

Ніхто рукі нам не заломвае

Начальнік аддзела рэагавання на камп'ютарныя пагрозы ўпраўлення абароны інфармацыі Нацыянальнага банка Сяргей МАЙСЕЙШЫН адзначае, што, як правіла, зламыснікам, якія выкарыстоўваюць метады сацыяльнай інжынерыі, людзі пераводзяць грошы і выдаюць персанальныя даныя абсалютна добраахвотна.

Асноўны скачок трэнду здарыўся летась, калі ў ліставадзе нашы грамадзяне былі атакаваныя з выкарыстаннем вішынгу. Гэты трэнд паспяхова перайшоў у 2020 год. Трэба разумець, што гэта прыбытковы бізнес, які купляецца, перапрадаецца, абкатваецца на іншых краінах, мяняюцца алгарытмы і скрыпты размовы.

Заўсёды мэта такога роду махлярства — выведаць канфідэнцыяльную інфармацыю альбо падштурхнуць чалавека да таго, каб ён у сеціве кудысьці зайшоў і нешта ўвёў. Як вынік — крадзеж грашовых сродкаў, завалоданне логінамі і паролямі. Як правіла, з усіх удзельнікаў фінансавых аперацый банкі цяпер абароненыя найлепш. Ашуканцы гэта разумеюць і атакуюць там, дзе ёсць пралом, і гэты пралом — кліенты банкаў. Тэхнічныя сродкі другасныя, таму што першасная крыніца атрымання інфармацыі для ашуканцаў — сам чалавек.

Паводле звестак Нацбанка, атрыманых у рамках інфармацыйнага абмену

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

з банкамі, за 9 месяцаў 2020 года было зафіксавана каля пяці тысяч паведамленняў аб вішынгу. Лідзіруе ў гэтай статыстыцы сталіца.

Праблема зразумелая, узнікае заканамернае пытанне: што рабіць? Сяргей Майсейшын бачыць выхад у павышэнні кіберадукаванасці насельніцтва праз правядзенне пастаяннай тлумачальнай работы з кожным кліентам.

Банкаматы ўжо не чапаюць: нерэнтабельна

Па словах **Паўла ПАПОВА, намесніка начальніка ўпраўлення па раскрыцці злачынстваў у сферы высокіх тэхналогій Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС,** сёлета самымі распаўсюджанымі відамі кіберзлачынства былі вішынг (тэлефоннае махлярства) і фішынг (разнавіднасць махлярства, пры якім зламыснік атрымлівае даныя картак сваіх ахвяр дзякуючы таму, што яны перайшлі па спецыяльнай спасылцы і пакінулі там гэтыя даныя).

За 11 месяцаў бягучага года ў параўнанні з 2019-м у краіне рост злачыннасці ў гэтых кірунках склаў 125 %. Спецыяліст адзначае, што калі браць па рэгіёнах, то лідзіруе Мінск: тут рост такой злачыннасці складае 115 %. У іншых рэгіёнах гэтая лічба нязначна ніжэйшая з улікам эканамічнага развіцця і ўключэння людзей у сферу інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, але яна таксама паказвае рост. Асноўны інструмент у гэтых разнавіднасцях махлярства — сацыяльная інжынерыя.

Амаль 90 працэнтаў злачынстваў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій — крадзеж сродкаў з дапамогай камп'ютарных сістэм. На другім месцы — несанкцыянаваны доступ. Ён таксама спалучаны з крадзяжом, таму што злачынцы нацэлены на электронную пошту ахвяры, яго асабістыя кабінеты на рэсурсах і ў мабільных дадатках, каб знайсці паролі і коды доступу да банкаўскіх картак.

Разам з тым некаторыя разнавіднасці махлярства, аб якіх раней шмат казалі, цяпер сустракаюцца досыць рэдка. Да іх адносяцца ў тым ліку скімеры і шымеры — спецыяльныя прылады, якія ашуканцы ўсталёўваюць на банкаматы, каб счытваць з іх дапамогай даныя картак.

«На бягучы год па краіне было выяўлена 3 або 4 выпадкі ўстаноўкі такога абсталявання на банкамат. Летась такіх выпадкаў было наогул у два разы менш. Для злачынцаў гэта не тыя грошы, каб дзеля іх можна было маштабна выкарыстоўваць такі від махлярства», — лічыць Сяргей Майсейшын.

Пакуль у 2020 годзе, па даных МУС, да адказнасці за ўчыненне злачынстваў у сферы інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій было прыцягнута каля дзвюх тысяч чалавек, з іх 90 — непаўналетнія.

Некаторыя страхі практычна беспадстаўныя

Напэўна, усе чулі, што ў грамадскіх месцах (у метро, аўтобусах, тралейбусах і на прыпынках) можна спісаць грошы з бескантактавай карткі, проста наблізіўшы плацежны тэрмінал да чужога кашалька або кішэні. Спецыялісты адзначылі, што аб такіх выпадках у Беларусі не чулі, аднак тэхнічна гэта магчыма.

Таму прадстаўнікі МУС параілі на перспектыву купіць для бескантактавай карткі спецыяльны ахоўны чахол, які цалкам ізалюе чып, каб немагчыма было спісаць з яго інфармацыю.

Разам з тым з пункту гледжання эфектыўнасці такі крадзеж блізкі да нуля, бо для яго, як лічыць Сяргей Майсейшын, павінен быць цэлы шэраг фактараў: трэба ведаць, дзе ляжыць картка, непрыкметна паднесці да яе тэрмінал і яшчэ шэраг іншых умоў, без якіх гэты від злачынства недзеяздольны.

Ашуканцы. Хто яны?

Паводле інфармацыі экспертаў праваахоўных органаў, злачынцы, якія займаюцца вішынгам, амаль усе размаўляюць са сваімі ахвярамі з-за мяжы. Было некалькі выпадкаў «сваіх» ашуканцаў, але іх хутка вылічылі і абмежавалі ў свабодзе.

Такім ценявым бізнесам займаюцца рускамоўныя маладыя людзі (хлопцы і дзяўчаты ва ўзросце 25-30 гадоў) з краін СНД (у асноўным з Расіі) з добра пастаўленым прыемным голасам, з уменнем выклікаць да сябе давер, з навыкамі пераканання.

Падчас гутаркі з псеўдабанкірам шумавым фонам служаць спецыфічны гук работы банкаўскай тэхнікі і аддаленая гаворка нібыта іншых супрацоўнікаў фінансавай установы.

Аб чым трэба памятаць, каб не стаць ахвярай махляроў

► Нікому не перадавайце сваю банкаўскую картку і яе поўныя даныя, паролі ад мабільнага і інтэрнэт-банкінгу.

► Калі вы згубілі картку ці ўбачылі па ёй аперацыі, якія не здзяйснялі, адразу звярніцеся ў банк і заблакіруйце картку. Гэта можна зрабіць не толькі па тэлефоне, але і ў мабільным або інтэрнэт-банкінгу.

► Калі вам тэлефануе чалавек, які прадстаўляецца супрацоўнікам банка, пакладзіце трубку і ператэлефануйце ў банк па тэлефоне службы кліенцкай падтрымкі, каб удакладніць інфармацыю. Важна не ператэлефаноўваць па тым нумары, з якога вам патэлефанавалі. Набярыце нумар банка, паказаны на яго сайце або на адваротным баку карткі. Не забывайце, што супрацоўніку банка не патрэбна інфармацыя пра нумар вашай банкаўскай карткі і камбінацыі пароляў.

► Не пераходзьце па невядомых спасылках з электроннай пошты, СМС або месенджараў, анлайн-рэкламы на сайты-аналагі пошукавых сістэм, папулярных інтэрнэт-крам, рэсурсаў дзяржустаноў, банкаў (каб пераканацца, ці на патрэбным сайце вы знаходзіцеся, праверце яго адрас у адрасным радку).

► Не загружайце праграмнае забеспячэнне, паходжанне якога выклікае сумненў.

Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Прычына многіх хвароб — няправільная чыстка зубоў

Стаматолаг пра прафесійную гігіену поласці рота

Каб падтрымліваць прыгожую ўсмешку, неабходна дбайная гігіена поласці рота — і ў дамашніх умовах, і прафесійная — у кабінеце стаматолага. Гэта дапамагае змагацца з бактэрыямі, якія прыводзяць да ўтварэння карыесу і праблем з дзяснамі. Пра важнасць гігіены і яе правілаў мы паразмаўлялі са стаматолагам-хірургам 7-й гарадской стаматалагічнай паліклінікі Вольгай КОМАР.

Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

— Вольга Раманаўна, што самае галоўнае ў гігіене?

— Тое, што праводзіцца яна павінна двойчы ў дзень. Раніцай пасля сняданку (а не адразу як усталі з ложка) і ўвечары перад сном. Гэтага правіла мусіць прытрымлівацца кожны чалавек.

Ёсць мноства фактараў, пры спалучэнні якіх мы атрымліваем карыес. А пасля могуць развівацца пульпіт, перыядантыт і іншыя хваробы, з якімі часам даходзіць да выдалення зубоў. Ва ўсіх нас утвараецца зубны налёт, а ў ім прысутнічаюць бактэрыі стрэптакокус мутанс (Streptococcus mutans), якія знаходзяцца ў поласці рота і для іх жыццядзейнасці важная наяўнасць вуглявадаў. Булачкі, цукеркі, халва, пірожныя — усё ліпкае і салодкае. Яны перапрацоўваюць гэтыя прадукты ў кіслату, што ўздзейнічае на зубную эмаль, і тая паступова пачынае растварацца. Яшчэ адным складнікам, акрамя бактэрый, з'яўляецца час. Чым даўжэй налёт знаходзіцца на зубе, тым большая верагоднасць, што карыес утворыцца. Таму наша задача — скараціць час знаходжання налёту ў поласці рота. З гэтай прычыны гігіена неабходная раніцай і ўвечары.

— Якія сродкі неабходныя для правільнай гігіены?

— Сярод асноўных — зубная шчотка, паста і ніць. Бакавыя паверхні зубоў — самыя цяжкадаступныя, там максімальна захоўваецца налёт і найчасцей утвараецца карыес. Таму іх варта старанна вычышчаць, і для гэтага падыходзяць зубныя ніці. У больш сталым узросце можна выкарыстоўваць ёршыкі.

— Ці ёсць пэўныя патрабаванні да зубной пасты?

— Яна абавязкова павінна ўтрымліваць фтор. Для зусім маленькіх дзетак утрыманне фтору меншае, чым для дарослых. Для дарослых гэта 1450 ppm, для дашкольнікаў — не менш за 500 ppm. У астатнім у плане выбару зубной пасты ўсё індывідуальна, яе смак, колер, кансістэнцыю кожны падбірае пад сябе. Некаторыя пацыенты мяркуюць, што паста вырашае ўсё. Насамрэч гэта не так важна. Галоўнае — сама тэхніка чысткі зубоў.

— Якія тут робяцца памылкі?

— У інтэрнэце можна і пачытаць, і паглядзець ролікі, яны так і называюцца — «Стандартны метад чысткі зубоў». Там падрабязна расказваецца, колькі разоў, з якога боку чысціць усе паверхні. Метад таксама апісаны Асацыяцыяй стаматолагаў — з малюнкамі па пункціках у адпаведных брашурках.

Ён нескладаны. У нас тры паверхні зубоў: шчочная, аклюзійная (тая, якой мы жуём) і язычна-нёбная (унутраная). Шчотку падбіраем стандартную — сярэдняй жорсткасці (жорсткая патрэбна толькі калі яе рэкамендуе стаматолаг). Яна ставіцца на шчочную паверхню, звычайна галоўка стандартнай шчоткі захоплівае два зубы. Вымятаючымі рухамі ад дзясны ўверх праводзім 8-10 разоў. Потым паступова перасоўваем на наступныя два зубы — таксама 8-10 рухаў. Спачатку гэта складана, пасля пераходзіць у рэфлекс і робіцца даволі хутка. Гэтак праходзім усю шчочную паверхню зубоў на верхняй і ніжняй сківіцы. З унутранага боку шчотку ставім пад вуглом 45 градусаў і ад дзясны гэтак жа вымятаючымі рухамі праходзім 8-10 разоў усе зубы — унізе і ўверсе. Спераду нязручна трымаць шчотку гарызантальна, таму ставім вертыкальна і таксама чысцім вымятаючымі рухамі. Жавальныя паверхні чысцім зваротна-паступальнымі рухамі, звычайна з імі праблем не ўзнікае. Памылкі мы робім, як правіла, з астатнімі: многія любяць рабіць зваротна-паступальныя рухі на шчочнай і язычна-нёбнай паверхнях і траўміруюць дзясну. Так утвараецца клінападобны дэфект у вобласці зуба: сціраецца эмаль, утвараецца клін, і ён адчувальны. Таму і для захавання зубоў, і для гігіены больш эфектыўныя вымятаючыя рухі.

— Колькі часу мусіць займаць чыстка зубоў?

— Тры-пяць хвілін. Спачатку правільная тэхніка падаецца складанай, трэба сябе кантраляваць, але да яе хутка прывыкаеш. Пасля чысткі выкарыстоўваем зубную ніць. Кожны прамежак паміж зубамі варта пачысціць. Спачатку праводзім па адным зубе і выводзім ніць, і пасля па другім. Адмотваецца каля 30 см. Брудная частка намотваецца на адзін палец, чыстая адмотваецца з іншага, і гэтай даўжыні хапае на ўсю поласць рота. Як правіла, на прыёме ўрач паказвае, як трымаць ніць і як яе зафіксаваць, ставіць рукі пацыенту.

І калі падабаецца, можна выкарыстоўваць апаласквальнікі поласці рота. Іх выбар сёння дастаткова вялікі. Пры кроватачывасці дзяснаў карысныя апаласквальнікі на аснове траў — яны дапамагаюць зняць запаленчы працэс. Але ні ў якім выпадку апаласквальнік не замяняе чысткі зубоў.

Калі гігіена выконваецца якасна, то пытанняў ніякіх не ўзнікае. І канешне, лепш рэгулярна прыходзіць на агляд да стаматолага. Калі не пашанцавала з генетыкай па стаматалогіі, здараецца, што карыес развіваецца вельмі хутка. Таму раз у тры-шэсць месяцаў пажадана наведваць урача. Лепш лішні раз прыйсці на агляд і справіцца з невялікай праблемай, чым потым займацца маштабным лячэннем.

— Усе праблемы з зубамі пачынаюцца з няправільнай гігіены ці яе адсутнасці, ці тут яшчэ важная і спадчыннасць?

— Гігіена — гэта адзін з асноўных аспектаў. Хоць, безумоўна, і генетыку ніхто не адмяняў. Але калі мы рэгулярна чысцім зубы, прыбіраем налёт, то верагоднасць развіцця карыесу меншая.

Гэтак жа і пры парадантозе, калі змяншаецца аб'ём коснай тканкі. Калі пры ўтварэнні зубнога каменя рэгулярна наведваць парадантолага, можна гэта захворванне папярэдзіць. Няправільна лічыць, што парадантоз — цалкам праблема гігіены, але яе адсутнасць нашмат абцяжарвае сітуацыю, захворванне тады прагрэсуе нашмат хутчэй.

Парадантоз пачынаецца з запалення дзясны, потым паступова змяншаецца аб'ём коснай тканкі вакол зуба. Калі зуб падзяліць на тры часткі, то 2/3 яго знаходзяцца ў коснай тканцы, а 1/3 — каронка — звонку. Калі змяншаецца аб'ём коснай тканкі, зуб знаходзіцца па-за косцю, з'яўляюцца паталагічная рухавасць, «кішэні», і ў выніку ён выпадае.

Наша сліна валодае мінералізуючымі ўласцівасцямі. Яны карысныя для эмалі, гэта дадатковы ахоўны механізм. Але гэтак жа сліна мінералізуе налёт. З мяккага ён ператвараецца ў зубны камень, які паступова нарастае, механічна ўздзейнічае на дзясну, змяншаецца сама дзясна, далей уздзейнічае на косную тканку, змяншаецца яе аб'ём. І калі пацыент ніколі зубы не чысціць, яны, акрамя таго, што ў налёце, дык яшчэ і ў камяні, і верагоднасць іх страціць вельмі вялікая. Калі рэгулярна счышчаць камяні, рабіць павязкі, апрацоўваць, то гэта запавольвае прагрэсіраванне хваробы.

Як пазбегнуць траўмаў у галалёд?

У апошні тыдзень у сувязі з холадам і галалёдзіцай Міністэрства аховы здароўя фіксуе рост колькасці траўмаў. За мінулыя суткі найбольшая іх колькасць была на Віцебшчыне.

У самым паўночным рэгіёне краіны да медыкаў за суткі звярнуліся 338 чалавек. З іх 315 атрымалі дапамогу амбулаторна, 23 чалавекі шпіталізаваны. У 337 была траўма з-за галалёдзіцы. У аднаго чалавека — ад холаду.

На Брэстчыне ў медустановы звярнуліся 163 чалавекі, 20 былі шпіталізаваны, 143 пасля аказання дапамогі адпушчаны дадому. У Гомельскай вобласці па дапамогу звярнуліся 222 чалавекі, з іх амбулаторную дапамогу атрымалі 195, 27 пацыентаў былі шпіталізаваны. На Магілёўшчыне сітуацыя падобная: за суткі 265 чалавек пацярпелі ад галалёду, 249 з іх адпусцілі дадому пасля аказання дапамогі, астатніх прыйшлося змясціць у стацыянар. У Гродзенскай вобласці да медыкаў звярнуліся 92 чалавекі, 80 з іх атрымалі амбулаторную дапамогу, астатнія шпіталізаваны. На Міншчыне ад галалёду пацярпелі 265 чалавек, з іх 16 давялося накіраваць у бальніцы. У Мінску 86 чалавек за апошнія суткі атрымалі галалёдныя траўмы, трое былі шпіталізаваны.

Як засцерагчыся ад траўмаў падчас неспрыяльнага надвор'я, расказаў **загадчык хірургічнага аддзялення 11-й гарадской паліклінікі Мінска Міраслаў ДЗЬЁЛАГ.**

— Па магчымасці старайцеся не выходзіць з дому, асабліва — у цёмны час сутак. Гэта самая дзейсная засцярога ад траўмаў. Калі ўсё ж такі прыходзіцца выйсці, найперш звярніце ўвагу на абутак. Ён мусіць быць зручным і ўстойлівым. Лепш за ўсё надзець зімовыя боты на платформе або з мяккай рыфленай падэшвай. Пазбягайце абутку на шпільках і высокіх абцасах.

Перасоўвацца па галалёдзе неабходна вельмі асцярожна. Лепш абыходзіць абледзянелыя месцы. Хадзіце не спяшаючыся, на напаўсагнутых нагах. Рукі ні ў якім разе нельга трымаць у кішэнях — інакш павышаецца верагоднасць атрымання цяжкіх траўмаў.

Не насіце цяжкія сумкі, асабліва з доўгімі ручкамі, бо цэнтр цяжару змяшчаецца. Пры гэтым стаяць або рухацца па абледзянелай паверхні нашмат складаней. Пры падзенні ратаваць трэба не маёмасць, а сябе — сумкі і іншыя прадметы трэба выпусціць з рук і групавацца ўсімі канечнасцямі.

Пажылым людзям у галалёд варта браць з сабой палку з гумовым наканечнікам. А цяжарным жанчынам не варта выходзіць на вуліцу без суправаджэння.

Падчас галалёду трымайцеся далей ад праезнай часткі і ні ў якім разе не перабягайце яе. Тармазны шлях у аўтамабіляў у гэты час значна павялічваецца. На прыпынку стойце далей ад краю дарогі, каб не паслізнуцца і не трапіць пад колы аўтобуса або тралейбуса.

Насамрэч засцерагчыся ад падзенняў можна толькі адным спосабам — быць як мага больш уважлівымі. Калі вы ўсё ж такі ўпалі і праз нейкі час адчулі боль, з'явіліся ацёкі — тэрмінова звярніцеся ў траўмапункт. Калі вы адчуваеце, што пасля падзення не можаце падняцца на ногі, неабходна патэлефанаваць у службу 103. Калі вы не можаце зрабіць гэта самі — папрасіце дапамогі ў тых, хто побач.

Зварот у траўматалагічны пункт або «хуткую» з'яўляецца абавязковым. Абысціся без дапамогі ўрача можна толькі ў выпадку лёгкага ўдару: проста прыкладзіце да выцятага месца што-небудзь халоднае — гэта паменшыць ацёк і боль, і апрацуйце маззю або гелем, які рассмоктвае сінякі (напрыклад, гепарын-гель, троксавазол). Грэць балючае месца нельга, эфект будзе супрацьлеглы.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Нават пры наяўнасці ўласнага аўтатранспарту ці грошай на таксі не трэба ездзіць па клініках самастойна. Тым больш — ехаць у першую бальніцу, якая трапілася. Медыцынская дапамога аказваецца па тэрытарыяльным прынцыпе: гэта залежыць не толькі ад раёна, дзе вы прапісаныя, але і ад месца, дзе вы атрымалі траўму, ад яе характару, а таксама загружанасці медустаноў пацыентамі ў дадзены момант. Спецыялісты службы 103 валодаюць сітуацыяй у рэжыме рэальнага часу і лепш ведаюць, у якую медустанову вас накіраваць, каб дапамога была аказана максімальна хутка, а ў саміх бальніцах і траўмапунктах пры гэтым не ўтвараліся заторы.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 8 (54)

Добрыя справы

Экаваланцёры робяць краіну больш прыгожай і зялёнай

Вось ужо 12 гадоў запар з 1 мая да 1 кастрычніка ў Беларусі праходзіць конкурс экаваланцёраў «Моладзь за чысціню гарадоў і вёсак», асноўная мэта якога — выхаванне беражлівых адносін да прыроды, любові да сваёй зямлі. Найлепшых з іх днямі ўзнагародзілі ў Мінску.

Сёлета маладзёжныя валанцёрскія атрады прыцягваліся да ўдзелу ў мерапрыемствах па добраўпарадкаванні помнікаў, мясцін пахаванняў, тэрыторый населеных пунктаў, месцаў масавага адпачынку, водаахоўных зон, паркаў, аб'ектаў культурна-гістарычнай і духоўнай спадчыны, а таксама да стварэння ландшафтных кампазіцый.

Узнагароджваючы пераможцаў, **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ** выказаў падзяку моладзі за праведзеную работу і адзначыў, што менавіта іх клопатам Беларусь з кожным днём становіцца больш прыгожай, зялёнай і чыстай.

ЗНАЁМІМСЯ З ПЕРАМОЖЦАМІ.

«Найлепшы валанцёрскі атрад (лагер) сярод вучнёўскай моладзі»:

І месца — валанцёрскі атрад «Вясёлка» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» ДУА «Арэхаўская сярэдняя школа імя Ю. В. Смірнова» Аршанскага раёна;

ІІ месца — валанцёрскі атрад пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» ДУА «Каменская сярэдняя школа Мазырскага раёна»;

ІІІ месца — валанцёрскі атрад «Рукі дапамогі» Бялыніцкага раённага камітэта ГА «БРСМ».

«Найлепшы валанцёрскі атрад (лагер) сярод студэнцкай моладзі»:

І месца — валанцёрскі атрад «Добрае сэрца» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» УА «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж»;

ІІ месца — валанцёрскі атрад «ЭкалогіЯ» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» УА «Гомельскі дзяржаўны педагагічны каледж імя Л. С. Выгоцкага»;

ІІІ месца — валанцёрскі атрад «Добрае сэрца» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» УА «Полацкі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці».

«Найлепшы валанцёрскі атрад (лагер) сярод працоўнай моладзі»:

І месца — валанцёрскі атрад «Твой выбар» Глыбоцкага РК ГА «БРСМ»;

ІІ месца — валанцёрскі атрад «Вачамі моладзі» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» УП «Віцебскаблгаз» ВУ «Полацкгаз»;

ІІІ месца — валанцёрскі атрад «Меркурый» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» Гомельскай мытні.

«Найлепшая ландшафтная кампазіцыя»:

І месца — валанцёрскі атрад «Добрае сэрца» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» УА «Полацкі дзяржаўны прафесійны ліцэй сельскагаспадарчай вытворчасці»;

ІІ месца — валанцёрскі атрад «Надзея» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» УА «Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П. В. Сухога»;

ІІІ месца — валанцёрскі атрад «ЭКАдазор» пярвічнай арганізацыі ДУА «Парплішчанская сярэдняя школа Докшыцкага раёна».

«Найлепшы валанцёр атрада (лагера) сярод навучэнскай, студэнцкай, працоўнай моладзі»:

І месца — Іван Белахвостаў, камісар валанцёрскага атрада «Няма перашкод» пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» ДУА «Юрцаўскі дзіцячы сад – сярэдняя школа Аршанскага раёна»;

ІІ месца — Уладзіслаў Белякоў, актывіст валанцёрскага атрада УА «Гомельскі дзяржаўны прафесійны ліцэй чыгуначнага транспарту»;

ІІІ месца — Анастасія Арбузава, сакратар пярвічнай арганізацыі ГА «БРСМ» ААТ «Баброва-Агра».

Маргарыта ДРАЗДОВА.
Фота прэс-службы Мінпрыроды.

Парадак на зямлі

ДАЕШ МІЛЬЁН!

Менавіта столькі сёлета будзе высаджана дрэў і кустоў

Адной з візітовак Беларусі лічыцца чысціня на сталічных праспектах і вуліцах райцэнтраў. Вядома, справа тут і ў менталітэце беларусаў, для якіх утульнасць, чысціня — элемент унутранай культуры. Пытанням навядзення парадку на зямлі надаюць вялікае значэнне і органы ўлады: ад мясцовай да цэнтральнай. З мэтай сістэматызацыі гэтай работы быў зацверджаны рэспубліканскі план мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі ў 2020 годзе. Як ён выконваецца, расказаў намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі, біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Максім ТАРАС.

— У Мінпрыроды сцякаецца ўся інфармацыя аб рабоце па навядзенні парадку на зямлі. Ці ёсць папярэднія вынікі бягучага года?

— Пакуль вядома, што за 11 месяцаў заданні рэспубліканскага плана выкананы практычна ў поўным аб'ёме за выключэннем адставання па некаторых работах, якія датычацца меліярацыйных сістэм у Віцебскай, Гомельскай, Мінскай абласцях.

— Рэспубліканскі план закранае літаральна ўсе сферы жыцця. Давайце спынімся на рэалізацыі тых мерапрыемстваў, якія бліжэй за ўсё па профілі да Мінпрыроды.

— Тады пачнём з такой актуальнай праблемы, як азеляненне тэрыторый агульнага карыстання. Гэта адна з вострых тэм, з якой гараджане звяртаюцца да нас у тым ліку па «гарачай лініі», на выязных прыёмах. На прыдамавых і іншых тэрыторыях населеных пунктаў за тыя ж 11 месяцаў высаджана дрэў і кустоў у 3-4 разы больш, чым прадугледжана планам. Гэтая работа заўсёды вядзецца ў комплексе. Папярэдне прыводзяцца ў парадак дзіцячыя пляцоўкі на прыдамавых тэрыторыях, устанаўліваюцца альбо рамантуюцца кантэйнерныя пляцоўкі. Напрыклад, установлена і адрамантавана 32 626 кантэйнераў для збору адходаў пры плане 13 444, у тым ліку 17 003 — для паасобнага збору адходаў пры плане 8520. У гарадах вялікая праблема — газоны. З аднаго боку, людзі выступаюць за азеляненне, з іншага — вытоптваюць іх. За названы перыяд уладкавана, рэканструявана і адрамантавана 386,48 га газонаў, а запланавана было ўсяго толькі 176,45 га. Да пытанняў азелянення гарадскіх тэрыторый трэба падыходзіць прафесійна, таму ў нас зацверджаны схемы азелянення тэрыторый агульнага карыстання ўсіх раёнаў сталіцы, ідзе распрацоўка такіх схем для Гомеля, Магілёва і Бабруйска.

— У сельскай мясцовасці вядзецца барацьба з інвазійнымі раслінамі, у прыватнасці з баршчэўнікам Сасноўскага. Што можна сказаць па выніках гэтага сезона?

— Сёлета карыстальнікам зямельных участкаў накіравана больш за тысячу інфармацыйных лістоў, дзе нагадвалася аб захаванні тэхналогій і тэрмінах правядзення работ па ліквідацыі баршчэўніка. Да 1 лістапада яны праведзены на плошчы 9185,1 га (пры плане 7947,8 га). Патэнцыйна знішчана 709 месцаў росту баршчэўніка. Між тым працягвалася інвентарызацыя месцаў росту інвазійных раслін. З мая да верасня выяўлена 939 новых месцаў росту баршчэўніка. Трэба сказаць, што і не ўсе землекарыстальнікі своечасова прыступілі да ліквідацыі баршчэўніка — на іх складзена 290 пратаколаў, накладзена штрафных санкцый на суму 45,2 тысячы рублёў. Таксама важна, каб землі, вызваленыя з-пад інвазійных відаў раслін, адразу ж уключаліся ў гаспадарчы абарот, інакш праз год-два на тых жа ўчастках зноў давядзецца змагацца з баршчэўнікам.

— Чым больш цывілізаваныя зоны адпачынку на водных аб'ектах, тым чысцейшыя рэкі і азёры. Што робіцца ў гэтым кірунку?

— У поўнай меры выкананы і нават перавыкананы рэспубліканскі план па такіх аб'ектах. Прывяду прыклад па двух паказчыках: усталяваны 421 кантэйнер для збору адходаў пры плане 383 штукі, абсталявана 222 грамадскія прыбіральні пры плане 213.

— Максім Аляксандравіч, асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі заўсёды ў поле зроку Мінпрыроды. Якія работы па іх добраўпарадкаванні вяліся сёлета?

— Перш за ўсё, установлена 410 інфармацыйных знакаў, каб людзі выразна разумелі статус тэрыторыі. Уладкаваны існуючыя зоны і месцы адпачынку, турыстычныя стаянкі ў нацыянальных парках і заказніках: установлены 132 малыя архітэктурныя формы, абсталявана 88 пляцовак для вогнішчаў, установлена 38 кантэйнераў для збору адходаў, у тым ліку для паасобнага, арганізавана 26 аўтамабільных парковак. Усе гэтыя мерапрыемствы дазволяць выконваць наша залатое правіла, каб гаспадарчая дзейнасць не шкодзіла прыродзе.

— Да 2022 года запланавана вывесці з эксплуатацыі ўсе міні-палігоны. Наколькі менш іх стала сёлета?

— За адзінаццаць месяцаў рэкультываваны 239 выведзеных з эксплуатацыі міні-палігонаў (пры плане 213).

— У добраўпарадкаванні гарадоў і вёсак актыўна прымаюць удзел мясцовыя жыхары. А як ідуць справы ў садаводчых таварыствах, дзе людзі бываюць наездамі?

— У цэлым дастаткова добра. На лецішчах, у гаражных і іншых спажывецкіх кааператывах добраўпарадкавана 60 кантэйнерных пляцовак для збору адходаў пры плане 59, установлена 95 кантэйнераў для збору адходаў пры плане 84. Асобна падкрэслю, што пры плане 27 у гаражных кааператывах установлена 29 ёмістасцяў для збору і захоўвання адпрацаванага масла. Яны актыўна запаўняюцца, гэта значыць, што шкодныя рэчывы не трапляюць у глебу.

— Работнікі цэнтральнага апарату і тэрытарыяльных падраздзяленняў Мінпрыроды не толькі кантралявалі выкананне рэспубліканскага плана па профільных кірунках, але і шмат зрабілі для добраўпарадкавання краіны. Раскажыце пра гэта.

— Вось ужо тры гады Мінпрыроды вядзе глабальную экалагічную кампанію «Добраўпарадкуем малую радзіму», у рамках якой праходзяць і месячнікі па вясновай і восеньскай пасадцы дрэў і кустоў у населеных пунктах. Вынікі за адзінаццаць месяцаў даволі важкія: высаджана 361,5 тысячы дрэў і 405,075 тысячы кустоў.

На тэрыторыях сельскагаспадарчых аб'ектаў высаджана 20,303 тысячы дрэў, 1,898 тысячы кустоў і ўздоўж аўтамабільных дарог 52,512 тысячы дрэў і 4,953 тысячы кустоў. Сёлета, мяркую, пасля канчатковага падвядзення вынікаў, мы выйдзем на мільён штук насаджэнняў.

Асабліва падкрэслю, што менавіта прадстаўнікі Мінпрыроды гэтай вясной далі старт пасадак дрэў па ўсёй краіне. У Мінску работы пачаліся са сквера «Палянка». Там пасадзілі больш за 30 драбналістых ліп. Супрацоўнікі цэнтральнага апарату Мінпрыроды і Мінскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя высадзілі 420 дрэў на ўчастку перасячэння аўтадарогі Р58 Мінск — Калачы — Мядзел і М-14. У Магілёве супрацоўнікі аблкамітэта высаджвалі дрэвы ў Пячэрскім лесапарку, які плануецца аб'явіць помнікам прыроды мясцовага значэння. Ні адна арганізацыя сістэмы Мінпрыроды не засталася ўбаку ад акцый па азеляненні.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
Фота прэс-службы Мінпрыроды.

На варце прыроды

«МАЕ ЛЮБІМЫЯ МЯСЦІНЫ — У ДАЛІНЕ ЯСЕЛЬДЫ»

Чым займаецца найлепшы грамадскі эколаг Брэстчыны?

Штогод Мінпрыроды праводзіць конкурс на найлепшага грамадскага эколага. Сёлета першае месца ў Брэсцкай вобласці і другое ў краіне заняў дырэктар Іванаўскага цэнтра дзіцяча-юнацкага турызму і краязнаўства Аляксандр ШУРХАЙ. Віншуем Аляксандра Фёдаравіча!

— Аляксандр Фёдаравіч, *скажыце, калі ласка, адкуль у вас любоў да прыроды, да вандроўнага жыцця?*

— Цікавасць да турызму і экалогіі я адчуў, калі вучыўся ў сярэдняй школе № 4 горада Іванава. Удзячны выдатным педагогам, якія падтрымлівалі мае захапленні. Паступіў на геаграфічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, дзе сустрэў аднадумцаў. Ну а прафесійна пачаў працаваць у дадзеным кірунку з 2006 года, калі ўзначаліў Іванаўскі цэнтр дзіцяча-юнацкага турызму і краязнаўства.

— Якім чынам спалучаеце турызм з экалагічным выхаваннем?

— На базе цэнтра дзейнічаюць 25 аб'яднанняў па інтарэсах, у тым ліку і экалагічнага профілю. З юных эколагаў сфарміраваны «Зялёны дазор». Падчас нашых падарожжаў падлеткі выяўляюць парушэнні прыродаахоўнага заканадаўства (пераважна выкідванне смецця), гутараць з

мясцовымі жыхарамі пра экадружалюбныя паводзіны. Пры неабходнасці яны разам з педагогамі рыхтуюць звароты ў адпаведныя органы для ліквідацыі парушэнняў. Вельмі радуе, што цяперашняя моладзь праяўляе экалагічную дасведчанасць, дбае пра раздзельны збор адходаў і паказвае станоўчы прыклад дарослым. Нашы навучэнцы таксама выявілі на тэрыторыі Іванаўскага раёна 12 дрэў, якім больш за 300 гадоў. Звесткі пра іх мы накіравалі ў Інстытут эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча з просьбай надаць гэтым старым дрэвам статус помнікаў прыроды. Традыцыйна далучаемся да акцый «Час Зямлі», «Зробім!», «Чысты лес», «Дапамажы птушкам». Акрамя непасрэднай работы з вучнямі, цэнтр праводзіў міжнародны фестываль «Мотальская рэгата», злёт аматараў воднага турызму «Днепра-Бугская эстафета» з экалагічнай накіраванасцю, а сёлета арганізаваў на тэрыторыі Іванаўскага раёна «Чыстыя гульні» — акцыю па збору смецця.

— Калі вы атрымалі статус грамадскага эколага?

— У 2017 годзе.

— Якія прыродныя мясціны маніторыце, з якімі праблемамі сутыкаецеся?

— Вяду назіранні за ўзбярэжжамі рэк і азёр, а таксама за ляснымі масівамі. Асноўныя парушэнні, якія фіксую, — паркаванне і мыццё аўтамабіляў у прыбярэжнай паласе, ігнараванне правіл аматарскага рыбалоўства падчас нерасту. З'явілася і новая праблема: рыбакі пакідаюць пасля сябе шмат пластыкавых упаковак ад прыкорму і прынады. Знаходжу несанкцыянаваныя звалкі буйнога побытавага і будаўнічага смецця, асабліва ў былых пясчаных кар'ерах (з кожным годам, праўда, усё менш).

— Дзе найбольш любіце вандраваць?

— У даліне ракі Ясельда паблізу аграгарадкоў Моталь і Тышкавічы — там адкрываюцца вельмі маляўнічыя краявіды.

— Ці атрымліваеце дапамогу ад дзяржаўных і грамадскіх прыродаахоўных арганізацый?

— Эколага-краязнаўчае грамадскае аб'яднанне «Ясельда», створанае намі ў 2013 годзе, неаднаразова атрымлівала гранты ад ПРААН і іншых арганізацый. На гэтыя сродкі былі набыты байдаркі, палаткі, абсталяванне для экалагічных экспедыцый і летнікаў, камп'ютарная тэхніка і канцтавары. У месцах, якія масава наведваюць рыбакі-аматары, установлены стэнды з прыродаахоўнай інфармацыяй. Дзякуючы супрацоўніцтву з таварыствам «Зялёная сетка» ў нас з'явіліся фотапасткі, друкаваныя матэрыялы экалагічнай тэматыкі. Брэсцкі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя інфармацыйна падтрымлівае нашу дзейнасць, аказвае метадычную і прававую дапамогу.

— Поспехаў вам у вашай шматграннай рабоце, яшчэ больш паплечнікаў і новых падарожжаў!

Фота з архіва Аляксандра ШУРХАЯ.

Супольна з грамадскасцю

ІНІЦЫЯТЫВА — ПАДТРЫМКА — СПРАВЫ

Як ажыццяўляюцца экалагічныя праекты ў Брэсцкай вобласці

Важным інструментам, які забяспечвае дыялог паміж Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, грамадскімі арганізацыямі і грамадзянамі, зацікаўленымі ў вырашэнні прыродаахоўных пытанняў, з'яўляецца функцыянаванне грамадскіх каардынацыйных экалагічных саветаў. Такія саветы створаны пры самім Мінпрыроды і яго тэрытарыяльных органах. 11 снежня адбылося выязное пасяджэнне савета пры Брэсцкім абласным камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя ў аграгарадку Каменюкі. У ім бралі ўдзел супрацоўнікі камітэта і ДПУ «Нацыянальны парк «Белавежская пушча», прадстаўнікі маладзёжных і іншых грамадскіх арганізацый.

Запаведнасць замацоўваецца мемарандумам

У цэнтры ўвагі пасяджэння была прыродаахоўная дзейнасць у Белавежы. Вопытам супрацоўніцтва з грамадскімі арганізацыямі ў захаванні і аднаўленні прыродных комплексаў падзяліўся **начальнік навуковага аддзела Нацыянальнага парку «Белавежская пушча» Дзмітрый БЯРНАДСКІ.** Гэтае супрацоўніцтва вядзе адлік з канца 1990-х, калі было наладжана ўзаемадзеянне з «Аховай птушак Бацькаўшчыны». Асабліва плённым стала апошняе дзесяцігоддзе: рэалізавана шмат сумесных праектаў. Напрыклад, пад дэвізам «Малыя ручаі — вялікі ўплыў» у 2012—2016 гадах прайшло аднаўленне гідралагічнага рэжыму ў гістарычнай частцы пушчы.

У 2013 годзе быў падпісаны трохбаковы мемарандум аб садзейнічанні ўмацаванню запаведнасці Белавежскай пушчы паміж Нацпаркам, Франкфурцкім заалагічным таварыствам і АПБ. У 2018 годзе мемарандум быў падоўжаны на наступную пяцігодку. Адпаведна з яго патрабаваннямі распрацоўваецца штогадовы план дзеянняў з канкрэтнымі мерапрыемствамі. «Грамадская арганізацыя выступае ў якасці медыятара для пошуку фінансавання прыродаахоўных праектаў: так, эксперты АПБ звяртаюцца ў міжнародныя фонды і перакананча даводзяць да іх нашы патрэбы, — патлумачыў схему ўзаемадзеяння Дзмітрый Бярнадскі. — Часцей за ўсё мы атрымліваем дапамогу ад фондаў Еўрасаюза». Важныя сумесныя здзяйсненні ўдзельнікаў мемарандума — паўторнае забалочванне Дзікага Нікара і далучэнне ў мінулым годзе да нацпарку 400 гектараў экалагічна важных зямель. Развіваюцца навуковыя даследаванні сістэмы «воўк — капытныя», буйных драпежнікаў, кажаноў. Вядзецца барацьба з інвазійнымі відамі, найперш з чырвоным дубам. Вывучаюцца працэсы, якія адбываюцца ў пушчы без антрапагеннага ўмяшальніцтва. Праводзяцца адкрытыя лекцыі ў падтрымку запаведнасці.

Калектыў Нацпарку пачынае распрацоўку плана кіравання Белавежскай пушчай на 2021—2030 гады.

Клопат аб лясных волатах

Гісторыю аднаўлення папуляцыі белавежскіх зуброў і сучасныя праблемы іх захавання акрэсліў **кандыдат біялагічных навук, вядучы навуковы супрацоўнік нацыянальнага парка Аляксей БУНЕВІЧ.** «У апошнія гады назіраецца стабільны рост пагалоўя. Па колькасці зуброў Белавежская пушча выйшла на першае месца ў свеце: цяпер тут жывуць 572 асобіны», — канстатаваў ён. У выніку натуральнага і штучнага рассялення на тэрыторыі пушчы ўтварылася пяць груповак зуброў. Паказчык натуральнай смяротнасці гэтых жывёл з году ў год стабільны і складае крыху больш за 3 %. А вось пладавітасць самак у параўнанні з 1971—1980 гадамі зменшылася на 50 %. Таксама трывожаць навукоўцаў выпадкі хваробы мочапалавых органаў у самцоў, якая вядзе да некрозу тканак і гібелі жывёл. Прычыны гэтых праблем — нястача натуральных кармоў ва ўмовах высокай харчовай канкурэнцыі з іншымі капытнымі, залішне высокая шчыльнасць статкаў, наяўнасць у пушчанскай раслінасці цяжкіх металаў. Зубры, якім у запаведнай зоне зімой не даюць падкормку, выходзяць на палі, выклікаючы трывогу ў вясковых жыхароў. Вясной жа і летам ўсе яны трымаюцца ў ахоўных межах пушчы.

Добрыя сэрцы

Другі сакратар Брэсцкага абласнога камітэта Саюза моладзі Максім ХАРЫТОНЧЫК расказаў, як 186 маладзёжных валанцёрскіх атрадаў колькасцю каля 3000 чалавек дзейнічаюць на карысць прыродзе і людзям. У красавіку і кастрычніку яны правялі «Тыдні леса» з пасадкай дрэў. Акцыя «Добрае сэрца» была накіравана на аднаўленне крыніц і прыдарожных святынь. Сёлета ў вобласці прайшло больш за 90 мерапрыемстваў пад дэвізам «За чысціню гарадоў і вёсак!», больш за 500 акцый і суботнікаў па навядзенні парадку на зямлі, у якіх найбольшай актыўнасцю вызначыліся Брэсцкі і Баранавіцкі раёны.

Веласіпедысты — сябры прыроды

Два выступленні былі прысвечаны развіццю веласіпеднага руху ў Брэсцкай вобласці. Інфармацыйна-асветніцкая ўстанова «За вела-Брэст», як растлумачыў член яе савета Віталь Коўш, ажыццяўляе маніторынг гарадской веластруктуры і ўносіць прапановы для яе паляпшэння, удзельнічае ў экалагічных святах і Тыдні еўрапейскай мабільнасці, праводзіць велапрабегі, прычым найбольш папулярным стаў маршрут «Брэст — Белавежская пушча». Разам з інжынерна-канструктарскім бюро «Брэстмаша» распрацавана мадэль велабагажніка для міжгародніх аўтобусаў, якая ўжо праходзіць сертыфікацыю. Велааматары супрацоўнічаюць з Брэсцкім абласным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя: выяўляюць нелегальныя звалкі смецця ў лясах і гатовыя дапамагаць у пошуку інвазійных раслін.

Ровар — выдатны сродак для аздараўлення і ўключэння ў паўнавартаснае жыццё людзей з абмежаванымі магчымасцямі. **Старшыня таварыства «Інваліды і асяроддзе» Іван ШМЫГА** і **кіраўнік абласнога велаклуба трох узростаў «РаДзея» Валянцін БАЛДЗЕНКА** яскравымі слайдамі і відэароліkам ілюстравалі свой аповед пра веламарафоны, падчас якіх людзі з інваліднасцю далучаюцца да пошуку крыніц, наведваюць аграсядзібы і разам са сваімі сябрамі робяць карысныя для прыроды справы. «РаДзейцы» пасадзілі алею з 50 дрэў у старажытным маёнтку Нямцэвічаў, правялі суботнік на беразе возера Соя і праклалі экасцежку, прыбралі смецце ў Брэсцкай крэпасці, выратавалі цар-дуб.

ПРААН абяцае дапамогу

На Брэстчыне дзейнічае 12 грамадскіх аб'яднанняў экалагічнага кірунку. Найбольш актыўна супрацоўнічаюць з прыродаахоўнымі органамі «Зялёны край», «Ясельда», «Неруш», «Час зямлі», «Беларускае геаграфічнае таварыства».

З 2018 года тэхнічная і тэматычная падтрымка ўсіх грамадскіх каардынацыйных экалагічных саветаў вядзецца праз праект «Далучэнне грамадскасці да экалагічнага маніторынгу і паляпшэнне кіравання аховай навакольнага асяроддзя на мясцовым узроўні», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і Праграмай развіцця ААН. Яго бюджэт складае 3,5 мільёна еўра. Кіраўнік праекта Вольга Чаброўская паабяцала, што планавая падтрымка будзе аказвацца і ў 2021 годзе. ПРААН распрацавала прапановы для паляпшэння работы савета.

Матэрыялы падрыхтавала Святлана ІШЧАНКА.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» (продавец) в лице ликвидатора ОАО «Жлобинский механический завод «Днепр» – директора ООО «Модель антикризисного управления» Куценковой Н.С. извещает о проведении 19 января 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
Условия продажи: **1.** Победитель (единственный участник) аукционных торгов самостоятельно и за свой счет проводит демонтаж, погрузку, транспортировку приобретенного на аукционе имущества. В случае нарушения целостности имущества Продавца при демонтаже и погрузке приобретенного имущества на Покупателя возлагается обязанность по приведению поврежденного имущества в первоначальное состояние. **2.** Действия по снятию с регистрационного учета транспортных средств (автотехники и механизмов), а также в случае необходимости получения регистрационных документов (при их отсутствии у Продавца) производится Покупателем на основании выданной доверенности Продавцом, за его счет и его силами. Переоформление документов на автотехнику и механизмы производится за счет покупателя. **3.** Земельный участок под объект продажи **(лоты №№ 1, 2, 3, 5, 6, 7)** будет выделен по заявке нового собственника, согласно законодательству РБ (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается)			
Местонахождение лотов: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, ул. Школьная, д. 8. **Информация о земельном участке:** лоты №№ 1, 2, 3, 5, 6, 7 расположены на земельном участке с кадастровым номером **340800000004000100** общей площадью **10,1123 га (право постоянного пользования).** **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания производственных зданий завода			
1	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14072** площадью **641,0 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **одноэтажное панельное здание склада материалов. Капитальное строение с инв. № 320/С-14074** площадью **209,1 кв. м**, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – **одноэтажное панельное здание гаража на 4 транспортные единицы.** Стеллаж (тех. отдел), инв. № 60615. Стеллаж (тех. отдел), инв. № 60609. Стеллаж (тех. отдел), инв. № 60610. Кран-штабелер, г/п 1тн, инв. № 50126. Стеллаж для металла, инв. № 11615. Стеллаж для металла, инв. № 11638. Стеллаж для хранения материалов, 10 шт., инв. № 11647. Стеллаж металлический, 10 шт., инв. № 11626. Стеллаж-накопитель, инв. № 11667. Стеллаж с подающим устройством, инв. № 11637. Кантователь (стапель), инв. № 60555. Ящик тары в количестве 365 шт., инв. № 20777	**195 920,00**	19 592,00
2	**Капитальное строение с инв. № 320/С-13340** площадью **1 086,3 кв. м**, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – **котельная.** Бак V-10 куб. м, инв. № 61023. Бак накопительный емк. 10 м³ (бочка Б-3), инв. № 60907. Труба дымовая (для двух водогрейных котлов), инв. № 61309. Бак деаэраторный емк. 25 м³, инв. № 40311. Дымовая труба к котельной, инв. № 60439	**166 400,00**	16 640,00
3	**Капитальное строение с инв. № 320/С-37925** площадью **44,3 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **здание проходной.** Крановая эстакада, инв. № 792. Кран мостовой г/п 10 тн, инв. № 50107. Кран мостовой г/п 20 тн, инв. № 50103	**270 400,00**	27 040,00
4	**Крановая эстакада**, инв. № 788. Кран мостовой г/п 10 тн, инв. № 50115	**85 100,00**	8 510,00
5	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14065** площадью **1 159,5 кв. м**, назначение – административно-бытовое здание, наименование – **здание административно-хозяйственное. Составные части и принадлежности:** трехэтажное административно-бытовое здание (А3/кп) с переходной галереей (Б1/кп)	**444 000,00**	44 400,00
6	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14066** площадью **1 553,2 кв. м**, назначение – двухэтажное кирпичное административно-бытовое здание с пристройкой, наименование – **здание административно-хозяйственное**	**641 000,00**	64 100,00
7	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14068** площадью **10 036,2 кв. м**, назначение – одноэтажное кирпичное здание цеха новой техники с кирпичной отапливаемой пристройкой для ремонта шаровых кранов, наименование – **здание специализированное иного назначения**	**1 717 000,00**	171 700,00
8	**Автомобиль MAZ 53366 021**, рег. № AI 2647, тип ТС – грузовой бортовой, тип двигателя – дизельный ЯМЗ-238, колесная формула 4х2 2001 года выпуска	**8 500,00**	850,00
9	Эстакада для легковых машин, инв. № 60401	**4 900,00**	490,00
10	Копировальный аппарат AR-5620NG, инв. № 61155	**290,00**	29,00
11	Копировальный аппарат Sharp AR5316. фА3 (тех. отдел), инв. № 60636	**80,00**	8,00
12	Плоттер DP HP DesignJet 510 24” (констр.), инв. № 61084	**200,00**	20,00
13	Плоттер DP HP DesignJet 510 24” (констр.), инв. № 61094	**280,00**	28,00
14	Установка безвозд. расп. на базе насоса «Кинг», инв. № 60525	**2 600,00**	260,00
15	Электрокара ЕП 006.сАКБ2, инв. № 60626	**3 300,00**	330,00
16	Агрегат окрасочный «Вагнер» – 7000Н, инв. № 61381	**2 000,00**	200,00
17	Агрегат окрасочный «Вагнер» – 7000Н, инв. № 61384	**2 000,00**	200,00
18	Агрегат окрасочный «Вагнер» – 7000Н, инв. № 61409	**2 000,00**	200,00
19	Дистилятор ДЭ4, инв. № 60977	**1 300,00**	130,00
20	Лампа ГУ-68А в термопечь, инв. № 60462	**6 400,00**	640,00
21	Настольно-сверлильный станок 2М112, инв. № 50183	**900,00**	90,00
22	Стол поворотный, инв. № 60464	**760,00**	76,00
23	Стол поворотный 7204-0023-01, инв. № 60673	**2 200,00**	220,00
24	Факсимильный аппарат «Панасоник», инв. № 61160	**20,00**	2,00
25	Стенд для испытания экскаваторов, инв. № 10034	**3 400,00**	340,00
26	Стеллаж для инструмента, инв. № 11636	**1 900,00**	190,00
27	Металлический склад для пропана, инв. № 60442	**7 000,00**	700,00
28	Стеллаж для хранения материалов, 10 шт., инв. № 11657	**14 200,00**	1 420,00
29	Агрегат гидроизоляционный СМБ-039 П.00.000 А, инв. № 61037	**3 300,00**	330,00
30	Агрегат гидроизоляционный СМБ-039 П.00.000 А, инв. № 61637	**2 900,00**	290,00
31	Эл. тележка 2Т-2047Б, инв. № 10515	**5 100,00**	510,00
32	Кондуктор для сборки рамы экскаватора, инв. № 61168, ввод в эксплуатацию – 01.02.2012	**3 800,00**	380,00
33	Кондуктор для сборки корпуса рукояти ЕТ 2301-10.02, инв. № 61371, ввод в эксплуатацию – 27.12.2013	**6 000,00**	600,00
34	Кондуктор для сборки порталов К1034845 и боковых элементов к 1034843, инв. № 61419, ввод в эксплуатацию – 10.05.2017	**3 300,00**	330,00
35	Кондуктор для сборки стрелы ЕТ 2301-10.02, инв. № 61372, ввод в эксплуатацию – 27.12.2013	**5 400,00**	540,00
36	Кондуктор для сборки стрелы, инв. № 61148, ввод в эксплуатацию – 28.11.2011	**3 900,00**	390,00
37	Кондуктор для сборки корпуса катка, инв. № 61167, ввод в эксплуатацию – 01.02.2012	**300,00**	30,00
38	Кондуктор для сборки и сварки бортов и перегородок на формы, инв. № 60992, ввод в эксплуатацию – 27.02.2009	**9 100,00**	910,00
39	Кондуктор для изготовления панелей, инв. № 61400, ввод в эксплуатацию – 30.07.2015	**2 400,00**	240,00
40	Кондуктор для обработки стрелы на станке МС21Г25, инв. № 61387, ввод в эксплуатацию – 31.07.2014	**3 900,00**	390,00
41	Кондуктор для расточки стрелы № 2, инв. № 61164, ввод в эксплуатацию – 01.02.2012	**1 300,00**	130,00
42	Кондуктор для расточки стрелы ЕТ, инв. № 61166, ввод в эксплуатацию – 01.02.2012	**500,00**	50,00
43	Кондуктор для сборки желобов, инв. № 61163, ввод в эксплуатацию – 01.02.2012	**600,00**	60,00
44	Кондуктор для сборки и сварки бортов и перегородок на формы, инв. № 60784, ввод в эксплуатацию – 31.10.2007	**1 600,00**	160,00
45	Кондуктор для сборки ковша, инв. № 61149, ввод в эксплуатацию – 30.11.2011	**500,00**	50,00
46	Стенд для сборки воздухо-охлаждающих панелей, инв. № 60585, ввод в эксплуатацию – 28.09.2004	**11 800,00**	1 180,00
47	Тележка для покрасочной камеры ТТ.00.000, инв. № 60792, ввод в эксплуатацию – 30.11.2007	**2 500,00**	250,00
48	Тележка для малярного отделения, инв. № 10514, ввод в эксплуатацию – 28.02.1986	**1 400,00**	140,00
49	Стеллаж, инв. № 60620, ввод в эксплуатацию – 30.12.2004	**100,00**	10,00
50	Стеллаж, инв. № 60608, ввод в эксплуатацию – 29.12.2004	**100,00**	10,00
51	Сварочный аппарат ВА-500.2, инв. № 61229, ввод в эксплуатацию – 30.06.2012	**1 700,00**	170,00
52	Сварочный аппарат ВА-500.2, инв. № 61225, ввод в эксплуатацию – 30.06.2012	**1 700,00**	170,00
53	Сварочный аппарат ВА-500.2, инв. № 61278, ввод в эксплуатацию – 19.11.2012	**1 700,00**	170,00
54	Сварочный аппарат ВА-500.2, инв. № 61277, ввод в эксплуатацию – 19.11.2012	**1 700,00**	170,00
55	Сварочный аппарат ВА-500.2, инв. № 61274, ввод в эксплуатацию – 19.11.2012	**1 700,00**	170,00
56	Источник питания FASTMIG KM 400, 2008 г. в., инв. № 60830	**3 300,00**	330,00
57	Кондиционер ROLSEN RAS 126 (12GW), инв. № 60521	**600,00**	60,00
58	Кондиционер ROLSEN RAS 126 (12GW), инв. № 60520	**600,00**	60,00
59	Барная стойка 1750-600-1100с/з, инв. № 60799	**1 400,00**	140,00
60	Барный стеллаж 2520-450-2300с/з, инв. № 60798	**2 700,00**	270,00
61	Барная стойка 1770-1090-1100/2300с/з, инв. № 60800	**3 100,00**	310,00
62	Кондуктор для сборки рукояти, инв. № 61147	**1 900,00**	190,00
63	Кондуктор для сборки дорожек, инв. № 61383	**8 300,00**	830,00
64	Установка гидродинамическая ГДУ-ТЕК-4г, инв. № 60660	**5 000,00**	500,00
65	Тележка СМЖ-557А, инв. № 10509	**5 000,00**	500,00
66	Тележка СМЖ-151, инв. № 10507	**5 000,00**	500,00
67	Электропечь ИСТ-0,25, инв. № 40131	**3 400,00**	340,00
68	Электропечь ИСТ-0,25, инв. № 40132	**3 400,00**	340,00
69	Воздухонагреватель ТС 300Е/К, инв. № 60729	**17 900,00**	1 790,00
70	Воздухонагреватель ВЖ 0,04-0,1 с баком, инв. № 61373	**1 800,00**	180,00
71	Вентилятор ВЦ 4-70-8 прав. 5,5/1000, инв. № 61402	**800,00**	80,00
72	Вентилятор № 8, инв. № 20073	**500,00**	50,00
73	Осушитель воздуха CDX-9, инв. № 60976	**2 600,00**	260,00
74	Пресс гидравлический для вулканизации 250х600, инв. № 50229	**20 600,00**	2 060,00
75	Пресс гидравлический для вулканизации 100х400, инв. № 50231	**9 900,00**	990,00
76	Теплоустановка VAGNER SDH 5kW, инв. № 60624	**80,00**	8,00
77	Сварочный аппарат JASIC TIG 315ACDC, инв. № 61385	**1 900,00**	190,00
78	Кондиционер LG-09LHN, инв. № 60710	**500,00**	50,00
79	Пресс КД2124К, инв. № 147	**7 600,00**	760,00
80	Автоматизированная система комплексного учета энергопотребления, инв. № 60994	**22 800,00**	2 280,00
81	Диспетчерский терминал Индел-1700 «Системы сбора информации телеметрии ИНДЕЛ», инв. № 61072	**900,00**	90,00
82	Удаленный терминал Индел-1708 «Системы сбора информации телеметрии ИНДЕЛ», инв. № 61071	**1 700,00**	170,00
83	Система измерительная Исток-Газ-03 Ду 25 мм, инв. № 61075	**5 900,00**	590,00
84	Система регулирования подачи тепловой энергии АБК № 3, инв. № 61157	**1 800,00**	180,00
85	Система контроля воздуха по содержанию угарного газа, инв. № 61078	**1 400,00**	140,00
86	Установка тепловая УТ 30 (N=29кВт), инв. № 60802	**4 700,00**	470,00
87	Установка тепловая УТ 30 (N=29кВт), инв. № 60803	**4 700,00**	470,00
88	Вентилятор ВЦ 4-70-3,15 пр (1,1 кВт, 3000 об./мин.), инв. № 61265	**200,00**	20,00
89	Вентилятор ВЦ 4-70-3,15 пр (1,1 кВт, 3000 об./мин.), инв. № 61266	**200,00**	20,00
90	Вентилятор ВЦ 4-70-3,15 пр (1,1 кВт, 3000 об./мин.), инв. № 61264	**200,00**	20,00

Продавец: Открытое акционерное общество «Жлобинский механический завод «Днепр», ул. Школьная, 8, 247210, г. Жлобин, Гомельская область. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. **8 (029) 303-53-09 – Григорович Павел Карлович.** **Шаг аукционных торгов –** 5 (пять)% от начальной цены предмета аукциона и не изменяется в течение всего аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 16 декабря 2020 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 января 2021 г. в 16.00 включительно. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. **В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того**, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с «Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденное постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16 (в ред. постановления Совмина от 12.07.2013 № 607).

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Дзейныя асобы

НЕ ДЗЕЛЯ СЛАВЫ, А ДЗЕЛЯ СПРАВЫ

Сыходзіць год 2020-ы, мякка кажучы, вельмі няпросты і, здаецца, для ўсіх...
Для Ларысы Власавай ён стаў яшчэ і юбілейным: сёлета, ні многа ні мала, 50 — Расонскаму цэнтру культуры і народнай творчасці, 35 з якіх ім кіруе Ларыса Міхайлаўна.

Ларыса ВЛАСАВА *(у цэнтры)* **з любімым «дзіцем» — хорам «Ветэран».**

З чаго пачаўся яе шлях у прафесію? Ну вядома ж, з дзяцінства. Бацька дзяўчынкі добра іграў на гармоніку, маці — хораша спявала і танцавала. Не дзіва, што малой таксама карцела і далучыцца, і ўсяму навучыцца, каб потым актыўна ўдзельнічаць у мастацкай самадзейнасці, рыхтаваць сцэнарыі, распрацоўваць праграмы канцэртаў, з поспехам выступаць.

Пасля школы гэта дзяўчынка скончыла культпрасветвучылішча, стала працаваць у Заборскім сельскім Доме культуры, набірацца вопыту ў старэйшых калег і вучыцца далей.

Не дзіва, што гэту няўрымслівасць досыць хутка заўважыла кіраўніцтва раёна, і Ларыса Міхайлаўна ўзначаліла раённы Дом культуры, а потым — і адпаведны аддзел у райвыканкаме. Вось толькі гэта адміністрацыйная, у многім кабінетная работа не прыносіла ёй ранейшага задавальнення: хацелася назад на сцэну, да людзей, а галоўнае не давала спакою даўняя мара — стварыць харавы калектыў.

Ёй Ларыса Міхайлаўна падзялілася са старшынёй тады пасялковага Савета дэпутатаў Генадзем Яромам і адразу ж сустрэла яго поўнае разуменне.

Першай удзельніцай хору «Ветэран» стала Ніна Брусяненка. А першае выступленне адбылося ў дзень Перамогі — 9 мая 1990 года.

Колькі іх, гэтых канцэртаў ды цёплых сустрэч з гледачамі, адбылося потым, ніхто не лічыў. У 2005-м хору было прысвоена высокае званне «народны», ён жа неаднойчы быў лаўрэатам абласнога ды іншых аглядаў-конкурсаў.

Усе гэтыя перамогі адбыліся дзякуючы цудоўным акампаніятарам Лідзіі Задзвінскай, Валянціне Івановай, Людміле і Алене Мірановіч, Аксане Лавецкай. Заслуга ж Ларысы Власавай у тым, што яна здолела ўдала падабраць галасы ўдзельнікаў хору не толькі па тэмбру, але і па стану душы. Трэцюю партыю ўпэўнена вядуць Марыя Галаўня, Тамара Хмялькова, Вольга Мурзо, Ніна Хамчаноўская. Другую — Лідзія Пашкоўская, Яўген Усвайскі, Людміла Несан, Фаіна Міланіч. Сапрана ў Марыі Васільевай, Лідзіі Дадэка, Тамары Какціс, Ніны Зуевай, Галіны Савітковай, Веры Сальнікавай, Іраіды Усцінавай, Ніны Нікалаевай. Радуе і тое, што склад народнага хору папаўняецца новымі ўдзельнікамі, якіх прыводзяць самі ветэраны.

Адметна, што Ларыса Власава займаецца не толькі з дарослымі. Будучыня, як вядома, за моладдзю, за дзецьмі. Зрабіць з іх артыстаў справа, вядома ж, нялёгкая. Хто-ніхто з малых саромеецца выступаць, баіцца сцэны і гледачоў, хвалюецца... Да кожнага патрэбен свой падыход. А ўсім разам — цвёрдая ўпэўненасць у бездакорным выкананні твораў.

Ларысе Міхайлаўне ўдаецца дасягнуць яе, перадаць выканаўцам, а потым і слухачам сваю любоў да песні.

Але ж кіраўніцтва калектывамі — гэта толькі частка работы Ларысы Власавай: сярод іншых клопатаў — і падрыхтоўка мерапрыемстваў, і супрацьпажарная бяспека, і выкананне санітарных нормаў (асабліва цяпер), і ахова працы, і выкананне ўсіх нарматыўна-прававых дакументаў... У свой час на жаночыя плечы кіраўніка лёг нават капітальны рамонт Дома культуры! Іншымі словамі адміністрацыйна-гаспадарчыя справы патрабуюць увагі куды больш, чым сама культурная дзейнасць.

Ларыса Міхайлаўна з усім спраўляецца. Сведчанне таму (апроч многага іншага) — нагрудны знак «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», які яна атрымала сёлета за шматгадовую плённую працу.

Аляксандр МАТОШКА,
Расонскі раён.

Ёсць пытанне

КОЛЬКІ ПЛАЦІЦЬ ЗА СЫРАВІНУ?

Лічыцца, што вялікія святы — Каляды, Вялікдзень, Новы год — трэба сустракаць у чыстых дамах і кватэрах. А таму напярэдадні я ўзялася за прыборку і вельмі шмат паспела зрабіць: перамыць-папрасаваць, навесці парадак у шафках і шафах.
Дайшла чарга і да кніжных: павыцірала пыл, перабрала паперы, у бок адклала ўсе непатрэбныя. У выніку атрымаўся досыць высокі стос, у які і дачка потым нешта падкінула...

Не адразу, але ж прыйшлося выкраіць час, каб занесці гэта «багацце» ў пункт прыёму другаснай сыравіны. Ён у нас, дзякуй богу, метраў за пяцьдзясят — блізка. Ва ўсякім разе — мне так здавалася. Аднак, пераступіўшы парог кватэры з двума пакункамі, я міжволі ўспомніла нашу прымаўку «блізка відаць, ды далёка дыбаць», бо цяжар, што апынуўся ў маіх руках бязлітасна гнуў спіну. Але ж і адступаць не выпадала: калі ўзялася, трэба было данесці?

Насілу — не раз і не два спыніўшыся, каб адпачыць — я такі адолела прыступкі ў пад'ездзе, а за імі — і той «блізкі» шлях да пункта прыёму.

...Каля яго стаяла чарга, хоць і невялікая, — з трох мужчын і дзвюх жанчын. Каля кожнага і кожнай стаялі мяшкі-пакункі, у якіх звінелі бутэлькі і вытыркалася нейкае жалеза, ляжалі перавязаныя шпагатам кнігі. Ад гэтага аж не па сабе неяк стала: успомнілася, як некалі, у часы маёй маладосці, мы збіралі макулатуру (кожная паперка была на ўліку!), каб здаць у такія вось пункты і купіць потым дэфіцытныя кнігі. А цяпер, выходзіць, наадварот?

З такімі думкамі я ўзваліла свае пакункі на вялікія вагі і вачам не паверыла: я, жанчына, прычым у гадах, прывалакла сюды 22 кілаграмы?!

У прадчуванні вартай узнагароды (у выглядзе грошай) падышла да прыёмшчыцы. Тая адлічыла мне... адзін (?) рубель і 75 капеек.

Ад нечаканасці я нават разгубілася, але потым усё ж спытала:

— А колькі вы плаціце за кілаграм макулатуры?

— Восем капеек, — пачула ў адказ.

Ну што тут можна дадаць? Як чалавек сумленны, збіраць макулатуру я, напэўна ж, буду, а вось здаваць... Наўрад ці. Ва ўсякім разе — пакуль за гэта не пачнуць плаціць, як за сыравіну, хоць сабе і другасную.

Ірына С.,
г. Гродна.

Чалавек — чалавеку

ЗАХВАРЭЦЬ ЛЁГКА, А ВОСЬ ПАПРАВІЦЦА...

У прасторнай бальнічнай палаце іх тады было трое. Хапала і цяпла, і святла... Зручныя ложкі з тумбачкамі пры кожным, побач халадзільнік у рост чалавека, зноў жа — душавы пакой, прыбіральня. Рэгулярна — абходы ўрачоў, кропельніцы, таблеткі, уколы, вільготная прыборка, кварцаванне. І кармілі тройчы на дзень з кефірчыкам нанач...

Што цікава, адна пацыентка ўсё гэта бачыла, з радасцю прымала і цаніла, другая — з ранку да вечара скардзілася і знаходзіла на што. Ну як жа: не тады зачынілі фортку пасля праветрывання; у душы не адразу пацякла гарачая вада; пасцельная бялізна магла быць прыгажэйшая; уколы робяць балюча; кварцаванне — гэта залішняе (хворым спакою няма); а з ежай і наогул — тое не ем, тое не п'ю...

Трэцяя з жанчын, слухаючы гэтае ныццё, хіба ўздыхала, бо што тут будзеш рабіць? Хворы чалавек ён і ёсць хворы...

Але ж, здавалася б, не настолькі... Тым больш калі ў палату, дзе ляжалі гэтыя трое, палажылі чацвёртую (перавялі — з палаты для цяжкіх), і яна стала расказваць, як там у шэсць гадзін раніцы ляжачым мяняюць памперсы, як санітарачкі варочаюць іх — перасцілаюць бялізну, як абмываюць, як з лыжачкі кормяць... Як уважліва да ўсіх ставяцца дактары, як увесь персанал стараецца дапамагчы, вылечыць — нават самых безнадзейных...

Думаеце, пачуўшы гэты расказ, тая нэндза хоць трохі прыціхла, прыкусіла язык? Не, нават не падумала!

І тут вось што кінулася ў вочы: першай з трох жанчын-пацыентак нібы сам Бог спрыяў у атрыманні працэдур, у лячэнні і выздараўленні, а вось другая на гэтым шляху ўвесь час «тармазіла».

Адгадайце, хто з іх хутчэй паправіўся?

Валянціна БОБРЫК,
г. Івацэвічы.

Як нас дураць

ЦІ ПАН, ЦІ ПРАПАЎ

І на тое, каб прапасці, шанцаў болей

У мяне з'явіўся ноўтбук. Цікавая — скажу вам — «цацка»! А калі ўмееш з ёю «гуляць»...
Я пакуль што вучуся. Уключаю. Заходжу ў інтэрнэт. Першае, што хачу знайсці, — гэта, вядома ж, лекі ад сваіх хвароб.

Так... На здымку нейкі мужчына. Пад ім — подпіс: каб пазбавіцца ад болю (не буду прызнавацца, у чым...), вазьміце дзве–тры кроплі...

Ну цікава ж, чаго?! Націскаю на таго мужчыну, адкрываецца тэкст. Чытаю адну старонку, другую, шукаю назву тых кропляў, а яе ўсё няма і няма: нідзе не называюцца... Хіба нарэшце з'яўляецца інфармацыя, што ў аптэках яны не прадаюцца, што гэта — страшэнны дэфіцыт. Аднак раздабыць яго можна (ура!) і нават бясплатна (?!), калі заказаць прэпарат...

Стоп. Прычым тут ён, калі размова ішла пра цудадзейныя кроплі? Гэта — па-першае. Па-другое, насцярожвае сама прапанова: для таго каб лекі займець, трэба хуценька запоўніць заяўку і пры гэтым «укласціся» ў адведзены час. Калі атрымаецца — пан: прэпарат даставяць бясплатна, калі не — прапаў: прыйдзецца плаціць. І трыста (?!) рублёў, скажу вам, не трыццаць, якіх таксама шкада, калі на пустое...

Значыць, няхай тым прэпаратам лечыцца нехта сам, а я — «пагуляю» далей.

Бачу, кардыёлаг настойліва раіць не шкодзіць свайму сэрцу «хіміяй», а пры павышаным ціску піць звычайны дзевяціпрацэнтны...

«Няўжо воцат? — цісну, каб даведацца, і з палёгкай уздыхаю, — не». Зноў называецца прэпарат (а гэта ўсё ж такі «хімія»!), зноў паведамляецца, што ў аптэцы яго няма. І зноў жа прапануецца афарміць заяўку (прозвішча, адрас, нумар тэлефона...), каб даставіць лекі за тры дні і бясплатна (калі ўкладуся ў адведзены час). Калі не? Вы здагадаліся: грошы на бочку... А вось пра тое дзевяціпрацэнтнае (не тое воцат, не тое нейкі напой) — болей ні слова, ад чаго на памяці хіба што казка пра папа і работніка Балду з яго крылатым «Не ганяўся б ты, поп, за дармаўшчынай...»

Іншымі словамі, дураць нашага брата, як Райкін казаў!

Паглядзела на гадзіннік — і сапраўды. Яшчэ і як дураць! Тры гадзіны патрачаны, а на што?

...З-за расстройства прыняла таблетку ад ціску і пішу: «Спадарства, калі ласка, не сядзіце ў інтэрнэце. Небяспечны гэта занятак. А што датычыцца хвароб і лекаў, дык надзейней схадзіць да доктара. Альбо проста пагуляць — чыстым паветрам падыхаць, потым добры савецкі фільм уключыць (крый бог, не сучасны — з морам крыві). Глядзіш — і палягчэе.

Зоя НАВАЕНКА,
Глыбоцкі раён.

Ад нашага стала — вашаму

Мой шчупак «сплывае» ўмомант

Каляды — адно з самых светлых і доўгачаканых свят. Мая сям'я спраўляе яго традыцыйна, як і большасць вернікаў: збіраецца разам і дома, гэта значыць, у мяне. Я жыву ў вёсцы адна, але на святы заўжды прыязджаюць дзеці. Яны прывозяць шмат рознай смакаты, але ж за сталом з нецярпеннем чакаюць маю каронную страву — фаршыраванага шчупака. Яго рэцэптам грэх не падзяліцца з чытачамі любімай газеты.

Для прыгатавання спатрэбіцца: сам шчупак (на 1-2 кг), батон, адно яйка, адна сярэдняя цыбуліна, 50-60 г масла, 100 г малака, два зубкі часнаку, соль, перац, прыправа для рыбы.

Перш-наперш чысцім і патрашым рыбу. Выкідваем жабры і вочы, мыем у халоднай вадзе. Каля галавы перарэзваем пазваночнік і мякаць. Скуру разам з галавой, акуратна аддзяляючы «мяса», сцягваем да хваста, дзе адсякаем пазванковую косць, пакідаючы хвост каля зрэзанай скуры. Аддзеленае «мяса» прапускаем праз мясарубку разам з часнаком і размочаным у малацэ батонам, падсмажанай на алеі цыбуляй. У фарш дабаўляем 50-80 г масла, яйка, соль, перац, добра вымешваем і не вельмі шчыльна напаўняем скуру шчупака. Жывоцік замацоўваем зубачысткамі, загортваем у мокрую сурвэтку, для таго каб прыдаць форму рыбы, не вельмі туга абкручваем ніткай.

Пасля гэтага шчупака (сурвэтку не здымаем) кладзём у каструлю з кіпнем, у які дадаём солі і прыпраў для рыбы. Варым мінут 30.

Гатовую рыбу вызваляем з сурвэткі, выцягваем зубачысткі, асцярожна прамываем халоднай кіпячонай вадой, выкладваем на блюда, не парушаючы формы, рэжам на кавалачкі. Падаваць можна са скрылікамі агуркоў, памідораў, маслінамі, маянэзам, зяленівам... Прыгатаваны такім чынам шчупак вельмі хутка «сплывае» са стала...

Смачна есці!

Софія КАБАРЫХА,
Баранавіцкі раён.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

Кніжныя імпрэзы

«ЦАР» У ТРАЕЦКІМ ПРАДМЕСЦІ

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры прэзентавалі новы раман Уладзіміра Ліпскага

Ва ўмовах пандэміі не так проста сабраць людзей на прэзентацыю кнігі, нават не так проста адважыцца правесці тую ці іншую імпрэзу. Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры спрабуе, захоўваючы ўсе меры засцярогі, праводзіць некаторыя мерапрыемствы. І, канешне ж, усе яны — як глыток чыстага паветра ў цяперашні няпросты час. Вось і нядаўняя прэзентацыя новай кнігі Уладзіміра ЛІПСКАГА «Цар» стала падзеяй у музейным і літаратурным жыцці Мінска.

«Цар» — раман, дзе спалучаюцца розныя часы. Наш з вамі сучаснік Зміцер Кужалоўскі зазірае ў даўніну і высвятляе акалічнасці лёсу легендарнай Марыны Мнішак, праходзіць яе сцежкамі-дарожкамі, спрабуе разабрацца, дзе сапраўднасць, а дзе прыдумка і авантуры ў лёсах легендарнай жанчыны і так званага Ілжэдзмітрыя. Масковія і Вялікае Княства Літоўскае, Усход і Захад, нашы прашчуры і прышэльцы з іншых земляў — раман вытканы з многіх падзей. Відавочна, што пісьменнік, уваходзячы ў мастацкае вырашэнне тэмы, перавярнуў горы гістарычнай, дакументальнай літаратуры, сам здолеў увайсці ў плынь сівой даўніны. Таму многія старонкі яго аповеду чытаюцца пераканаўча, падштурхоўваюць да сур'ёзных разважанняў і над лёсам Беларусі.

На імпрэзе, акрамя самога аўтара — лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Уладзіміра ЛІПСКАГА, выступілі дырэктар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Мікалай СУПРАНОВІЧ (згаданы твор якраз і выйшаў у гэтым аўтарытэтным кніжным выдавецтве краіны), заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь Георгій ЛОЙКА, кніжны графік і жывапісец Леанід ДАНЭЛІЯ (і Лойка, і Данэлія — аўтары ілюстрацый да рамана «Цар»), дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Міхаіл РЫБАКОЎ, старшыня Беларускага фонда культуры Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь, акцёр тэатра і кіно Валерый АНІСЕНКА, заслужаны артыст Беларусі, акцёр Леанід УЛАШЧАНКА, выдавецкі рэдактар Міраслава ШАВЫРКІНА, пісьменніца і журналістка Ларыса КУЧАРАВА.

Варта заўважыць, што ўсе выступоўцы былі адзінадушныя ў тым, што, нягледзячы на шырокія абсягі кніжнага рынку ў Беларусі, мастацкіх твораў, якія б папулярызавалі айчынную гісторыю, дапамагалі ўнікнуць у найбольш складаныя яе перыпетыі, усё ж такі не хапае. І таму надзвычай важным падаецца зварот да гістарычнай тэматыкі пісьменнікам, якога добра ведае чытач нашай краіны, — Уладзімірам Сцяпанавічам Ліпскім. Да месца былі і развагі пра тое, што раман патрабуе выдання на рускай ды іншых мовах. Хацелася б, каб кнігу ўбачылі і адкрылі ў Расіі, у Польшчы, Украіне, Літве. «Цар» сапраўды таго варты.

А Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры ў самым сэрцы Мінска — у Траецкім прадмесці — чакае новых наведвальнікаў.

Мікола БЕРЛЕЖ.

Лабірынты мастацтва

«ВАНГОГІСТЫ ГАГЕН»

Да 80-годдзя з дня нараджэння Віталя ЧАРНАБРЫСАВА

Патрыярх беларускага авангарду, дзядуля мінскага андэграўнду, парушальнік спакою, падзвіжнік дзіцячай творчасці, выдатная асоба 1970—1990-х гадоў... Усе гэтыя словы часцей за ўсё выкарыстоўваюць мастацтвазнаўцы і журналісты для характарыстыкі мастака Віталя Чарнабрысава, якому 15 снежня споўнілася 80 гадоў.

З імем Чарнабрысава звязваюць нараджэнне альтэрнатыўнага мастацкага руху ў Мінску і Беларусі ў канцы 1960-х гадоў. Першы чысты і паслядоўны прадстаўнік андэграўнду — фанатык-адзіночка, дзівак-стоік, сапраўдны маргінальны мастак сутарэнняў. Год, праведзены ў Каўнасе ў тэхнікуме прыкладнога мастацтва імя Жукаса (1966), толькі ўмацаваў жаданне працаваць самастойна. 1967 год стаў пачаткам ягонай творчасці. У 1968 годзе мастак упершыню павёз свае творы на так званую кватэрную выстаўку ў Ленінград — сталіцу андэграўнду. Піцер прыняў Чарнабрысава і назаўсёды пазбавіў яго комплексу непаўнавартаснасці аматара. Пытанне мастацкай адукацыі ніколі не ставілася ў андэграўндзе на першы план. Ацэньвалі найперш мастацкую арыгінальнасць. «Карціны Чарнабрысава пахнуць зямлёй і агародам, чаго ў піцерскім мастацтве даўно няма», — напісаў у каталогу яго сябар, пецярбургскі мастак і мастацтвазнаўца Міхаіл Іваноў.

Амаль два дзесяцігоддзі ён жыў на два гарады — Мінск і Ленінград, трычатыры разы на год ездзіў туды да сяброў. Функцыі гарадоў выразна дзяліліся: Піцер — горад творчых зносін і натхнення, Мінск — работы і самаадукацыі, пасля — «горад, для якога я нешта зрабіў». У Піцеры прапанавалі выстаўку ў музеі Фёдара Дастаеўскага, калекцыянеры пачалі набываць яго творы па 25-30 савецкіх рублёў за палатно (эцюд Канстанціна Сомава ў піцерскім антыкварыяце каштаваў тады 40 рублёў). Тым не менш у Мінску як мастака яго ведалі толькі блізкія сябры: Кірушчанка, Хобатаў, Маціевіч, Арцімовіч, Давідзенка, Хмызнікаў, якія былі частымі гасцямі ў двухпакаёўцы на вуліцы

Якуба Коласа (цяпер — Лагойскі тракт), дзе заўсёды, карыстаючыся цярплівасцю інтэлігентных бацькоў, «таўклася» мастацкая тусоўка. Чарнабрысаў, як магніт, прыцягваў маладых мастакоў, меў для іх рэпутацыю своеасаблівага «гуру». Вабіла цэласнасць яго жыццёвай праграмы: ён не спакушаўся на прынады афіцыёзу — кар'еру, славу, грошы. Да апошняга ўвогуле ставіўся як да сродку «імгненнага «кайфу» і ўмудраўся жыць пры мінімальнай іх колькасці. Для астатніх ён быў хутчэй не мастаком, а прапагандыстам яскравага дзіцячага фармалізму.

Яшчэ ў 1968 годзе Віталь, як і многія мастакі, пачаў весці дзіцячую студыю — пры ЖЭСе Савецкага раёна. Дзеці для яго стаяць побач з любімымі Пікасо, Руо, Клее: «Якая розніца, колькі каму гадоў — 4 ці 80, калі ўсе мы — мастакі». Чарнабрысаў вучыў на найлепшых прыкладах народнага мастацтва. Дзеці ў яго студыі малявалі на шпалерах і распісвалі пад'езды. Праз студыю Віталя Чарнабрысава за два дзесяцігоддзі прайшло каля 3000 дзяцей!

Да канца 1990-х Чарнабрысаў цалкам адпавядаў уяўленню аб «мастаку сутарэняў»: працаваў начным ахоўнікам, пажарным у Мастацкім музеі, потым дворнікам у Палацы мастацтваў. У мастацкае жыццё ўвайшоў як адзін з заснавальнікаў мастацкага аб'яднання «БЛО». У 1980-я меў устойлівую рэпутацыю адыёзнай фігуры — удзельніка тайных піцерскіх багемных тусовак, авангардыста і хіпі. Дапамагалі гэтаму ўяўленню касцюмы ў стылі «мілітары» колеру хакі, якія ён закупляў адразу некалькі і насіў доўгія гады (зручная ўніформа піцерскага аб'яднання маладых мастакоў «Міцькі»), заплечнік, набіты кніжкамі.

Зараз пра Віталя Чарнабрысава здымаюцца фільмы, тэлевізійныя перадачы, наладжваюцца яго выстаўкі, выходзяць кнігі. У 2010 годзе прайшла першая персанальная выстава ў галерэі «Вільнюс», затым у галерэях Шчамялёва і «Ў».

Ён падараваў 27 твораў мастацкаму музею, у якім працаваў амаль 23 гады, яшчэ з часоў легендарнай Аладавай. Ездзіў у экспедыцыі па Беларусі, выконваў бясконцую мужчынскую работу, якой хапае ў музеі: грузіў, вешаў карціны, цягаў скульптуры... Дарэчы, Аладава аднойчы вырашыла «прасунуць» — прапанавала паступаць у «Рэпінку» — Акадэмію мастацтваў у Ленінградзе. Віталь быў сур'ёзна напалоханы і неяк адгаварыўся: «Мне гэта непатрэбна...»

Манера яго жывапісу вызначылася адразу і не мянялася дзесяцігоддзямі. Экзатычна-вобразны тэатральны свет карцін Чарнабрысава сонечны, цёплы і іранічны, як мудрая народная казка. Ён населены вольнымі цыганамі, якія крадуць коней і нават месяц з неба; жыццярадаснымі цыганкамі; тоўстымі гетманамі з булавамі і маленькімі актрысамі-лялькамі ў пышных крыналінах з веерамі і чырвонымі ружамі; аголенымі вясёлымі Пенелопамі, якія ляжаць у чаканні Адысея. Але ёсць і адваротны бок: бязногія інваліды ў самаробных вазках; маленькія людзі ў хісткіх лодках, якія з адчаем змагаюцца з жахлівымі хвалямі акіяна; старыя з кульбачкамі (гэта тэма апошняга часу, калі самому стала цяжка хадзіць з-за траўмы нагі). Раўнавага свету.

Карнавальнасць, тэатральны пачатак творчасці Чарнабрысава ідуць ад захаплення Пікасо; бясконцае самакатаванне пераробкамі і паляпшэннямі — ад любімага Руо. Дух іроніі і самапародыі пранізвае творчасць Чарнабрысава. Тут ён выступае тыповым рамантыкам і адначасова інсітным мастаком. Як і народныя прымітывісты, часта ўжывае ў жывапісе малярныя фарбы і сланечнікавы алей (які ў безграшоўе ідзе па назначэнні). Часта маляваў паўзверх купленых танных рэпрадукцый у залачоных рамах, не надаючы ўвагі плямам ад фарбаў на раме — тыповая брутальная эстэтыка майстроў андэграўнду як рэакцыя на залакіраванае афіцыйнае мастацтва музеяў. Ад прымітыву, лубка ідуць і шматлікія заклікі — тэкставыя надпісы на яго карцінах: «Не біце птушак!», «Хутчэй ліся, лёгкае алегра!».

Незлічоная серыя яго аўтапартрэтаў (больш за 300). Яны вылучаюцца асаблівай энергетыкай і з'яўляюцца маніфестам творцы: «Аўтапартрэт з Сакратам і птушкай», «Аўтапартрэт у вобразе цыгана», «Аўтапартрэт з анёлам, які трубіць», «Атурэчаны аўтапартрэт»... Гарачы, напружаны, крыху скошаны позірк. Чорныя плямы пад вачыма. Нязменная «беларморына» ў роце. Патрабавальнасць да свету. Неўтаймаваная сіла і энергія. Для яго аўтапартрэт — і нарцысава люстэрка, і маскарад, і споведзь, і мара, і проста штодзённы экзерсіс. Чарнабрысаў — моцны каларыст. Часам яго аўтапартрэты набліжаюцца да знакамітых суцінскіх: той жа гратэск, цяга да жорсткага самапазнання.

Жывапіс Чарнабрысава, дынамічны, пастозны, пластычны, злеплены з густога, смачнага шматфарбавага рэчыва, вызначаюць як экспрэсіяністычны. «Я — вангогісты Гаген!» — сказаў неяк ён пра сябе.

Няспешнага, асцярожнага падыходу патрабуе работа з камянямі: «Камень хацелася рэзаць з дзяцінства. Я ж у Цянь-Шанях (у Фрунзе. — **Аўт.**) нарадзіўся, а горы — вялікая справа». Чарнабрысаў працуе толькі з цвёрдымі пародамі — гранітам, базальтам, кавалкамі мармуру. Матэрыял шукае паўсюль і знаходзіць як грыбы: «Ідзеш па горадзе і збіраеш у мяшок... Асабліва яны прыгожыя пасля дажджу, яны тады больш характэрнымі робяцца».

Камяні Чарнабрысава — гэта гульня асацыяцый, культуралагічных адсылак. Перад тым, як увасобіць у камені вобраз, мастак доўга прыглядаецца да яго, круціць у руках. Затым — мінімальная апрацоўка толькі ўручную. Пасля доўгай карпатлівай работы з'яўляюцца абліччы — паганскія, асірыйскія, егіпецкія... Вялікія камяні Чарнабрысаў апрацоўвае і ставіць усюды, дзе да іх праявяць цікавасць, маленькія — раздае знаёмым, каб захаваліся. Так паступова з'явіліся «сады камянёў» Чарнабрысава ў Гомелі, Дзяржынску, Смілавічах. Чарнабрысаў увогуле лёгка развітваецца з творамі, не шкадуе іх для падарункаў.

«Ён адзін з нямногіх, хто жыў так, як хацеў», — гавораць пра яго сябры. Ён быў і застаецца адной з найцікавейшых асоб горада, а яго кватэра-майстэрня, у якой застыў час, — своеасаблівым музеем мінскага нонканфармізму.

Надзея УСАВА,
вядучы навуковы супрацоўнік
Нацыянальнага мастацкага
музея Беларусі.

МУЗЫКА З НОТАМІ НАСТАЛЬГІІ

ЯШЧЭ ў 1983 годзе ў вёсцы Кіркаўшчына Нясвіжскага раёна я адшукаў скрыпача, які на пачатку трыццатых гадоў мінулага стагоддзя стварыў аркестр і іграў нават у палацы Радзівілаў па запрашэнні самога гаспадара. Звалі гэтага музыканта Іван Буглай. У яго аркестры гучалі кларнет, труба, дзве скрыпкі і барабан. Перад вайною кіркаўшчынскі аркестр удзельнічаў у прэстыжных конкурсах, і таму вясковыя юнакі-музыкі імкнуліся дасягнуць найвышэйшага выканальніцкага майстэрства.

— Тады не было ніякіх табе клубаў і палацаў культуры, нас запрашалі на маладзёжныя ігрышчы, вяселлі-бяседы, ігралі на вясковых фэстах, выконвалі мазурку і абэрак, факстрот і бастон, польку і вальс, танга і кракавяк — усё, што прасілі танцоры, — распавядаў Іван Міхайлавіч. Ён даставаў і настройваў зроблену сваімі рукамі скрыпку, прыгадваў мелодыі, якія ў час яго маладосці былі надзвычай папулярныя.

Я здымаў Івана Буглая разам з жонкай Марыяй Антонаўнай у садзе пад яблыняй. Такіх самабытных музыкаў, як кіркаўшчынскі скрыпач, я сустракаў няшмат. Іх трэба было шукаць, ездзіць па вёсках. У васьмідзясятых і пачатку дзевяностых яны яшчэ ігралі на нядзельных кірмашах, на провадах у армію, на фальклорных святах. На вяселлях іх амаль не было: музычную прастору запаланіла эстрада з электрычнымі інструментамі. І ўсё-такі мне шанцавала: раз-пораз здымаў таленавітых самародкаў, якія не адмаўляліся ад свайго, традыцыйнага, народнага. Пямятная сустрэча адбылася з музыкантамі з вёскі Дворышча Расонскага раёна. Не верылася: адразу чатыры гарманісты! У Веткаўскім раёне, у славутай вёсцы Неглюбцы, жыў унікальны гарманіст і майстар па вырабе гармонікаў Пятро Прыходзька. Памяць пра яго ў наш час нагадваюць галасістыя двухрадкі з чырвоным перламутрам, на якім інкруставана слова «Перамога» (ён быў франтавік).

Слава аркестра вёскі Перхавічы Баранавіцкага раёна неслася далёка за межы раёна. Калі музыканты пасталелі, сталі дзядулямі, то ўсё роўна не спяшаліся развітвацца з музыкай, без іх не праводзілася ніводнае свята. Вось і на ўшанаванне паэта-каваля Паўлюка Багрыма ў вёску Крошын «Перхавіцкіх музыкаў» таксама запрасілі.

Партрэт вядомага на Смаргоншчыне акардэаніста-жалеечніка Мечыслава Багдановіча ў маім архіве з'явіўся ў ліпені восемдзесят дзявятага — у час этнафальклорнага кірмашу, які праходзіў каля вёскі Жодзішкі. Пасля вайны ў краіне было шмат музыкантаў-інвалідаў, якія напоўніцу хапілі гора, але не паказвалі сябе слабымі, панурымі, хворымі. Наадварот, як і Мечыслаў Багдановіч, сваёй музыкай неслі пазітыў і стваралі адпаведны настрой. А яшчэ захоўвалі душу народнай культуры.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-40989 (назначение – здание гостиниц, мотелей, кемпингов, наименование – здание гостиничного комплекса «Гостиный двор»), площадью 458,7 кв. м, расположенное по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, д. Цыборы, 76 с оборудованием и земельными насаждениями: водонагреватель GRF 841 VA ECOUNIT 500-1С, плита электрическая ПЭМ4-020, набор мебели для бара, 4 набора мебели для спальни, набор мебели в фойе, набор мебели для кафе, 2 котла газогенераторных ТЭМ-45, ковровое покрытие, камера видеонаблюдения, панно «Лидский замок», душевая кабина «Тритон», 4 фена настенных, туя Смарагд, можжевельник, туя Даника.

Лот № 1 расположен на земельных участках:

- кадастровый номер 423685213166000036, площадью 0,4319 га (назначение – для обслуживания гостиничного комплекса), находящемся по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, д. Цыборы, 76. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), код – 2.7, площадью 0,4319 га; земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5.2, площадью 0,0075 га;
- кадастровый номер 4236852000660000136, площадью 0,0510 га (назначение – для обслуживания инженерных коммуникаций (водопровод)), находящемся по адресу: Лидский р-н, Тарновский с/с, У-13. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), код – 2.7, площадью 0,0510 га.

Начальная цена продажи – 621 045 руб. (шестьсот двадцать одна тысяча сорок пять рублей) с учетом НДС.

Сумма задатка – 62 104 руб. (шестьдесят две тысячи сто четыре рубля).

